Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся
Proletariuhoj ствке wzysskrajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЕЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЦАНА ЗЕЛАК
7 верасьня 1931 г.
№ 207 (3296)

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Сакратарыят ЦК КП(б)Б, заслухаўшы паведамленьне інструктара ЦК т. Галодка і сакратара РК т. Клютко аб ходзе ўборачнай кампаніі і калектывізацыі ў Бягомльскім раёне, адзначае, што дзякуючы правільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, райпартарганізацыя дабілася значных посьпехаў у справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі раёну (калектывізацыя на 76,5 проц. бядняцка-серадняцкім гаспадарак раёну з ахватам пасеўнай плошчы да 82 проц., гэтым самым закончыў у асноўным суцэльную калектывізацыю, перавыканаў вясенні пасеўны плян на 2 проц. і пасеў тэхнічных культур у параўнаньні з мінулым годам павялічыўся на 50 проц., першымі ў БССР скончылі ўборку сенажаці і г. д.)

II. Адначасова з гэтым ЦК падкрэсьлівае і зварочвае ўвагу РК і ячэек на тое, што арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, сіласаваньне, мабілізацыя сродкаў, уборка яравых і лёну, а таксама будаўніцтва, камплектаваньне таварных фэрм і зда ча таварнай прадукцыі праходзіць абсалютна нездавальняюча.

III. Асабліва ЦК зварочвае ўвагу партарганізацыі на тое, што ў апошні час партыйныя ячэйкі Бяроэкаўскага, Глінскага і Нядольскага сельсаветаў пад ціскам кулацтва і яго дапаможнікаў у партыі—апартуністаў, дапусьцілі грубейшыя скрыўленьні партыйнай лініі, выразіўшыяся ў прымусовасьці, адміністраваньні, запалохваньні, масавым штрафы, дачу цьвёрдых заданьняў серадняком, пазбаўленьне сенажаці аднаасобнікаў, каб гэтым самым заставіць уступіць іх у калгасы. Такім чынам апартуністы гэтых ячэек спаўзьлі з шляху барацьбы з кулаком, на шлях барацьбы з серадняком і сваёй тактыкай прыраўнялі серадняка да кулака, самі ня ўбачылі сапраўднага кулака, прытупілі клясавую пільнасьць мас, падрывалі наш саюз з серадняком і дапамагалі кулаку ў барацьбе з калгасным будаўніцтвам. Несвоячасовае і недастатковае папярэджваньне партарганізацыі з боку РК КП(б)Б аб пагоні за дутымі процантамі калектывізацыі, і справа-апартуністычнага сама цёку ў арганізацыі і гаспадарчым замацаваньні калгасаў, таксама ў сваю чаргу садзейнічала скрыўленьню лініі партыі з боку гэтых ячэек.

Выходзячы з вышэйазначанага ЦК КП(б)9 пастанаўляе:

1) Адобрыць прынятыя Бягомльскім РК КП(б)Б мерапрыемствы для барацьбы з «левацкім» перагібамі ў раёне, як-то: зьняцьце з работы сакратароў ячэек, старшынь Бяроэкаўскага, Глінскага; Асоўскага і Нядольскага сельсаветаў і прыцягненьне іх да адказнасьці, правядзеньне пашыранага пленуму РК для мобілізацыі ўвагі навокал зьнішчэньня апартуністычнай практыкі і ліквідацыі маючыхся прарываў ва ўборачнай кампаніі, правядзеньне пленумаў сельсаветаў і сходаў усіх ячэек па пытаньні «левацкіх» загібаў у калгасным будаўніцтве і налогавым абкладаньні і пасылку т.т. з раённага актыву для працы ў гэты сельсавет і г. д.

Абавязаць РК у самы карацейшы тэрмін карэнным чынам выправіць па мылкі і весьці гэтую справу да канца,

2) Прапанаваць РК і ячэйкам узмацніць барацьбу з кулаком і яго дапаможнікамі правымі і «левымі» апартуністамі, сканцэнтраваўшы галоўную ўвагу і сілы партыйнай, камсамольскай арганізацыі, калгасных і савецкіх устаноў на арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні калгасаў, для чаго неабходна:

а) дабіцца правільнай расстаноўкі сіл у калгасах, ліквідаваць абязьлічку ў карыстаньні інвэнтаром, машынамі і коньмі, увесьці сапраўдную зьдзельшчыну ва ўсіх калгасах раёну, праводзіць улік працы кожнага калгасьніка па якасьці і колькасьці ў працадзінях і ня менш як адзін раз у пяць дзён запісваць выпрацаваныя працадні ў працоўныя кніжкі;

б) правесьці шырокае растлумачэньне ва ўсіх калгасах і вёсках пастановы НКЗ і Калгасцэнтру аб парадку разьмеркаваньня даходаў у калгасах і зьнішчэньня зьявішча паздоцкага разьмеркаваньня хлебных авансаў і прэмтавараў, падзорнага разьмеркаваньня кармоў праводзячы разьмеркаваньне ўсіх даходаў, як грашовых, так і натуральных толькі ў адпаведнасьці з выпрацаванымі працаднямі;

в) падвоіў тэмпы і з большавіцкай упартасьцю закончыць уборку лёну, яравых, правесьці азімую сяўбу, зяблевае ворыва і дабіцца хутчэйшага сканчэньня будаўніцтва і ўкамплектаваньня таварных фэрм на 100 проц., выканаць плян сіласу і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве, згодна пляну і тэрміну, разгарнуўшы шырока мэтад сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчных плянаў і ўзаемадапамогі пасьпяваючых адстаючым у гэтай працы.

3) Прапанаваць РК і ячэйкам сачыць за тым, каб у практыцы калгаснага будаўніцтва і падатковага абкладаньня цьвёрда праводзілася лінія партыі, як-то: арганізацыя новага прыліву праходзіла на аснове дабраахвотнасьці, недапускалася кулакі ў калгасы, прытрымліваўца таго, каб усе мерапрыемствы ў адносінах да кулацтва, дача цьвёрдых заданьняў, індывідуальнае абкладаньне праводзілася пры самым актыўным удзеле калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас, на падставе папярэдняй шырока праведзенай масавай растлумачальнай працы з боку ячэек і сельсаветаў, дабіваўца самых добрасуседзкіх адносін паміж калгасамі і аднаасобнікамі беднякамі і сераднякамі.

4) ЦК папярэджвае арганізацыю, што дапушчэньне паслабленьня працы сярод аднаасобнікаў і асабліва сярод беднаты, як у калгасах, так і па-за калгасамі, ні ў якім разе ня можа быць цярпіма і праца сярод іх павінна ўзмацніцца, што і дапаможа арганізацыі хутчэй скончыць калектывізацыю раёну поўнасьцю і на гэтай падставе ліквідаваць кулацтва як клясу.

5) ЦК адзначае, што аднэй з рашаючых умоў пасьпяховага правядзеньня калектывізацыі і замацаваньня калгасаў і саўгасаў у раёне, зьяўляецца рашучая перабудова партыйна-масавай працы ячэек у напрамку апэрацыйнага конкрэтнага кіраўніцтва з боку РК і ўсіх раённых арганізацый, правільная расстаноўка партыйных сіл у калгасах з такім разьлікам, каб былі абслужаны галоўным чынам брыгады, групы, калёны і г. д. і была ўзмоцнена вядучая роля кожнай парт'ячэйкі і кожнага камуніста ў паасобку.

Аб пачатковай і сярэдняй школе

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б)

...учы на шляху ажыцьцяўленьня праграмы камуністычнай партыі, згодна якой «школа павінна быць ня толькі правадніком прынцыпаў камунізму агул, але і правадніком ідэйнага арганізацыйнага выхаваўчага ўплыву пралетарыяту на паўпралетарскія і палетарскія пласты працоўных мас у сэнсе выхаваньня пакаленьня, здольнага канчаткова ўстанавіць камунізм» (праграма УсеКП(б), пралетарская дзяржава дамаглася вялізарных посьпехаў у справе паширэньня школьнай сеткі і перабудовы школы. Лік вучняў пачатковай і сярэдняй школе павялічыўся з 7.890 тыс. у 1914 годзе да 20 млн. у 1931 г. Карэнным чынам змяніўся сацыяльны склад школы; дзеці рабочых і шырокіх мас працоўных у школы, на месцах рашей магчымасьць навучаць сваіх дзяцей у школе, тады ня пяпер асноўным кантынгентам школы. Навучаньне на роднай мове ахапіла самыя адсталыя ў культурных адносінах народы Савецкага Саюзу і праводзіцца на 70 мовах. Трымцпова іншым зрабіўся зьмест ей работы школы.

Савецкая школа, якая ставіць сваёй дачай «падрыхтоўваць усебакова развітых членаў камуністычнага грамадства», дае дзецям непараўнальна больш шырокі грамадзка-палітычны кругазгляд і агульнае разьвіцьцё, чым да вялікацыйная буржуазная школа. За апошнія гады ўзрос ўзровень агульнай адукацыі дзяцей у савецкай школе.

Асабліва значныя посьпехі дасягнуты школай пасьля пістарычнай пастановы 16 зьезду партыі аб ўвядзеньні всагульнага пачатковага навучаньня. Толькі за апошні год лік вучняў у пачатковай і сярэдняй школе ўзрос з 15 да 20 млн. Звыш гэтага ФЗУ і тэхумамі ахоплена 1.400 тыс. вучняў. Побач з рашаючымі крокамі па ажыцьцяўленьні абавязковага навучаньня дзяцей школьнага ўзросту, кола значна прасунулася наперад па шляху злучаньня школьнага навучаньня з працоўцыйнай працай і грамадзкай работай, дзякуючы чаму закладзены асновы перабудовы школы на базе палітэхнізму.

Павялічэньне колькасьці майстэрняў, хоць недастатковых па колькасьці і тэхнічна яшчэ слаба абсталяваных, у злучэньні з правадзімым прымусовым школ да заводаў, саўгасаў, МТС і калгасаў, даваляе разгорнуць усё больш шырока і паскорана політэхнізацыю школы.

Аднак, ня гледзячы на ўсе гэтыя зьмяненьні, ЦК канстатуе, што савецкая школа далёка яшчэ не адпавядае сваім вялізарным патрабаваньням, якія перад'яўляюцца ёй сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва. ЦК лічыць, што карэнны недахоп школы ў гэны момант заключаецца ў тым, што навучаньне ў школе не дае дастатковага ахопу агульнаадукацыйных ведаў, нездавальняюча вырашае задачу падрыхтоўкі для тэхнікумаў і для вышэйшай школы зусім пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навук (фізыка, хімія, матэматыка, родная мова, геаграфія і інш.). У сілу гэтага політэхнізацыя школы набывае ў радзе выпадкаў фармальны характар і не падрыхтоўвае дзяцей, як усебакова развітых будаўнікоў сацыялізму, звязваючых тэорыю з практыкай і аўладаючых тэхнікай.

Усякая спраба адарваць політэхнізацыю школы ад сыстэматычнага і моцнага ўсваеньня навук, асабліва фізікі, хіміі і матэматыкі, выкладаньне якіх павінна быць пастаўлена на аснове строга вызначаных дакладна распрацаваных праграм, вучэбных плянаў і праводзіцца па строга ўстаноўленым раскладзе, зьяўляецца грубейшым скажэньнем ідэі політэхнічнай школы. «Камуністам можна зрабіцца толькі тады, калі абагаціш сваю памяць ведамі тых багацьцеў, якія выпрацавала чалавецтва» (Ленін, т. XXV, стар. 388).

У аснову ўсёй далейшай работы школы ЦК прапануе пакласьці ўказаньні Леніна, даныя ім яшчэ ў 1920 годзе. Падкрэсьліваючы, што нельга пытаньні політэхнізацыі ставіць абстрактна, што гэтыя пытаньні трэба вырашыць у цесным сувязі з канкрэтнымі задачамі, якія стаяць перад партыяй, Ленін заначыў, што неабходна:

«1) Уклісяцца раньняй спэцыялізацыі, распрацаваць інструкцыю аб гэтым.

2) Пашырыць ва ўсіх прафтэхшколах агульнаадукацыйныя прадметы.

3) Бязумоўным заданьнем паставіць неадкладны пераход да політэхнічнай адукацыі, ці вярней, неадкладнае ажыцьцяўленьне ряду даступных зараз-жа крокаў да політэхнічнай адукацыі...

Нам патрэбны цесьляры, сьлёсары зараз-жа. Бязумоўна. Усё павінны зрабіцца сталярамі, сьлёсарамі і інш., але з такім-жа дадаткам агульнаадукацыйнага і політэхнічнага мінімуму».

Задача школ 2-ой ступені (12—17): вярней, вышэйшых клясаў 2-й ступені даць магчыма ведаючага сваю справу, умаўне здольнага рабіцца майстрам і замяніць практычна падрыхтаванага да гэтага, столяра, цесьляра, сьлёсара і г. д. з тым, аднак, каб гэты «рамесьнік» меў шырокую агульную адукацыю (ведаў мінімум асновы гэткі-та і гэткіх-та навук: паказаць дакладна якіх); быў камуністам (дакладна паказаць, што павінен ведаць), меў політэхнічны кругазгляд і пачаткі, асновы політэхнічнай адукацыі.

Мэтавіта:

а) асноўныя разуменьні аб электрычнасьці (дакладна вызначыць якія);

б) аб прыстасаваньні электрычнасьці да механічнай прамысловасьці;

в) тое-ж—да хімічнай;

г) тое-ж — аб пляне электрыфікацыі РСФСР;

д) наведаў ня менш 1—3 разоў электрычную станцыю, завод, саўгас;

е) ведаў гэткія-та асновы агрономіі і г. д. распрацаваў дэталёва мінімум ведаў».

Выходзячы з усяго гэтага, ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1. Асноўныя задачы школы

Прапанаваць НКАсьветы саюзных рэспублік безадкладна арганізаваць навукова-марксыцкую прапрацоўку праграм, забясьпечыўшы ў іх дакладна акрэсьленае кола сыстэматызаваных ведаў (родная мова, матэматыка, фізыка, хімія, геаграфія, гісторыя), з разьлікам, каб з 1-га студзеня 1932 году пачаць выкладаньне па пераглядзеных праграмах.

Адначасова з пераглядам праграм НКАсьветы павінны прыняць рад мер, забясьпечваючых сапраўдную магчымасьць выкладаньня па новых праграмах (інструктаваньне настаўнікаў, выданьне адпаведных паказаньняў і г. д.).

Ужываючы ў савецкай школе рознастайныя новыя мэтады навучаньня, якія змогуць спрыяць выхаваньню ініцыятыўных і дзейных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва, неабходна разгарнуць рашучую барацьбу супроць лёгкадумнага мэтадычнага пражэктэрства, насаджэньня ў масавым мештабе мэтадаў, загадзя на практыцы неправеравых, што асабліва яскрава ў апошнія часы выявілася ва ўжываньні так званага «мэтаду праектаў». Выця каўшыя з антыленінскай тэорыі «адмираньне школы» спробы пакласьці ў аснову ўсёй школьнай работы так званы «мэтад праектаў» прыводзілі фактычна да разбурэньня школы.

ЦК абавязвае НКАсьветы саюзных рэспублік неадкладна арганізаваць і паставіць на належную вышыню навукова-дасьледчую работу, прыцягнуўшы лепшыя партыйныя сілы для гэтай справы, і перабудаваць яе на строга марксыцка-ленінскіх пачатках.

Выходзячы з таго што складанай часткай камуністычнага выхаваньня зьяўляецца політэхнічнае навучаньне, якое павінна даць вучням «асновы навук», знаёміць вучняў «у тэорыі і на практыцы з усімі галоўнымі галінамі вытворчасьці», праводзіць «цесную сувязь навучаньня з прадукцыйнай працай—прапанаваць НКАсьветы саюзных рэспублік на працягу 1931 году шырока разгарнуць сетку майстэрняў і рабочых пакояў пры школах, злучаючы гэту работу з прымацаваньнем школ да прадпрыемстваў, саўгасаў, МТС і калгасаў на аснове дагавораў.

Злучаючы навучаньне з прадукцыйнай працай неабходна праводзіць на гэткай аснове, каб уся грамадзка-прадукцыйная праца вучняў была падпарадкавана вучэбным і выхаваўчым мэтам школы.

Прадпрыемствам, саўгасам, МТС і калгасам аказаць усямерную дапамогу НКАсьветы ў вырашэньні гэтай задачы шляхам вызначэньня неабходнага абсталяваньня і інструментаў для школьных майстэрняў і лябараторый, вылучэньня кваліфікаваных рабочых і спэцыялістаў для непасрэднага ўдзелу ў рабоце школы, дапамогі пэдагогам у вывучэньні вытворчасьці і г. д.

НКАсьветы саюзных рэспублік стварыць у кожным раёне і ва ўсіх гарадох сетку ўзорных школ, паставіўшы іх у больш спрыяючыя матар'яльныя ўмовы і згрупаваўшы ў іх лепшыя пэдагагічныя сілы з тым, каб настаўніцкія масы, рабочыя, калгасьнікі і вучні маглі на практыцы вучыцца ў іх будаўніцтву політэхнічнай школы.

Для садзейнічаньня політэхнізацыі школы НКАсьветы саюзных рэспублік арганізаваць у 1931-32 навучальным годзе сетку невялікіх політэхнічных музэяў, а таксама спэцыяльных політэхнічных аддзяленьняў пры існуючых краязнаўчых музэях. ВСНГ аказаць фінансавае і арганізацыйнае садзейнічаньне правядзеньню гэтага мерапрыемства. НКАсьветы супольна з дзяржаўнымі выдавецтвамі стварыць тыповыя політэхнічныя бібліятэкі для вучняў і пэдагогаў на роднай мове. НКАсьветы супольна з кіно-арганізацыямі распрацаваць мерапрыемствы па скарыстаньні кіно для школы, асабліва для політэхнізацыі.

У перыяд сацыялізму, калі пралетарыят ажыцьцяўляе канчатковае зьнішчэньне клясаў ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, выключна важнае значэньне набывае вытрыманае камуністычнае выхаваньне ў савецкай школе і ўзмацненьне барацьбы супроць усякіх спробаў прывіць дзецям савецкай школы элементы антыпралетарскай ідэалёгіі.

У сувязі з гэтым ЦК прапануе партыйным арганізацыям узмацніць кіраўніцтва школай і ўзяць пад непасрэдны нагляд пастаноўку выкладаньня агульна-політычных дысцыплін у школах-сямігодках, у пэдтэхнікумах і пэдагагічных ВНУ.

Пацьвярджаючы неабходнасьць выкананьня ў тэрмін пастановы ЦК ад 25-га ліпеня 1930 году аб агульным абавязковым пачатковым навучаньні, Цэнтральны камітэт у мэтах хутчэйшага ажыцьцяўленьня патрабаваньняў праграмы партыі аб агульнай і політэхнічнай адукацыі для ўсіх дзяцей і паддзёткаў да 17 год, прапануе СНК СССР распрацаваць плян усеагульнага абавязковага сямігадовага навучаньня.

2. Палепшаньне мэтадычнага кіраўніцтва школай

Адзначаючы нездавальняючае становішча кадраў і арганізацыі мэтадычнага кіраўніцтва школай у органах народнай асьветы, ЦК прапануе Культпропу разам з Наркамасьветамі і Культпропамі ЦК нацкампартый у месячны тэрмін распрацаваць мерапрыемствы па падрыхтоўцы марксыцка-ленінскіх кадраў для мэтадычнай работы ў органах народнай асьветы і ўмацаваць кіруючыя зьвены мэтадычнага кіраўніцтва лепшымі партыйнымі тэарэтычнымі і пэдагагічнымі сіламі.

Адзначаючы значны адрыў навукова-дасьледчых устаноў у галіне пэдагогікі ад практычных задач школы, ЦК УсеКП(б) прапануе Наркамасьветам саюзных рэспублік згрупаваць работу адпаведных дасьледчых інстытутаў галоўным чынам на вывучэньні і абагуленьні вопыту, набытага практычнымі работнікамі школы, асабліва політэхнізацыі.

Абавязаць Наркамасьветы саюзных рэспублік увесьці ў сыстэму органаў народнай асьветы інстытут інструктараў, пачынаючы з раённых зьвеньняў, для сталай практычай дапамогі настаўніку ў яго штодзённай рабоце ў школе.

Склад інструктароў укамплектаваць з вопытных настаўнікаў, добра ведаючых школу і яе задачы, з разьлікам на менш двух на раён. Абавязаць усіх камуністаў, якія знаходзяцца на кіруючай рабоце ў галіне народнай асьветы, у найкарацейшы тэрмін зўладаць мэтадычным бокам школьнай работы.

Паставіць перад таварыствам пэдагогаў-марксыстаў пры Камуністычнай акадэміі задачу распрацоўкі па заданьнях Наркамасьветы асноўных пытаньняў мэтадычнай дапамогі настаўніцтву ў яго штодзённай рабоце.

Пераглядзець існуючыя пэрыядычныя выданьні па пытаньнях пэдагогікі ў мэтах рашучага палепшаньня якасьці і павароту іх тварам да школы і яе патрэб, з абавязковым прыцягненьнем у рэдакцыйны апарат на стаўнікаў.

У рабоце сярод настаўнікаў трэба кіраваць паказаньнем, даным Леніным яшчэ ў 1922 г.: «Народны настаўнік павінен быць у нас на такой вышыні, на якой ён ніколі не стаяў, не стаіць і ня можа стаяць у буржуазным грамадзтве» (т. XVIII, ч. 2-я, стар. 115):

3. Кадры

Улічваючы рост патрэбны ў сувязі з ажыцьцяўленьнем усеагульнага, у пэдагагічных кадрах і падвышэньні іх кваліфікацыі, прапанаваць Дзяржпляну СССР і Наркамасьветам саюзных рэспублік скласьці ў 2-месячны тэрмін плян падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў забясьпечваючых поўнасьцю здавальненьне патрэбы ў настаўніках для пачатковай і сярэдняй школы, і ўнесьці яго на зацьверджаньне Саўнаркому СССР.

Арганізаваць азнаямленьне настаўнікаў з асновамі вытворчасьці на заводах, у саўгасах, у МТС і ў калгасах з такім разьлікам, каб на працягу 1931-32 г. гэта азнаямленьне ахапіла ўсе выкладчыцкія кадры.

Наркамзему СССР пры вызначэньні кантынгентаў для навучальных устаноў па падрыхтоўцы агранамаў улічыць патрэбнасьць школ калгаснай моладзі, а таксама аказаць неабходную дапамогу органам народнай асьветы ў справе прыцягненьня агранамічных сіл, занятых у вытворчасьці, да работы ў ШКМ.

Увесьці ва ўсіх індустрыяльных і с.-г. вузах азнаямленьне з мэтадамі работы па політэхнізацыі школы і пастаноўкай вытворча-тэхнічнага навучаньня.

Запрапанаваць ЦК УсеЛКСМ і Наркамасьветы саюзных рэспублік распрацаваць спэцыяльныя мерапрыемствы па падборы піянэраважатых, замацаваньню іх на рабоце, падвышэньні іх агульнай і спэцыяльна-пэдагагічнай кваліфікацыі, разглядаючы іх як каштоўны рэзэрв для падрыхтоўкі новых пэдагагічных кадраў.

Даручыць Дзяржпляну, НКФіну, ЦК працасьветы і Наркамасьветам саюзных рэспублік у дэкадны тэрмін распрацаваць мерапрыемствы па падвышэньні зарплаты для настаўніцтва пачатковай і сярэдняй школы. ЦК саюзу працасьветы сумесна з Наркамасьветамі саюзных рэспублік у месячны тэрмін распрацаваць сыстэму дыфэрэнцыяванай аплаты працы настаўнікаў па раёнах, па кваліфікацыі і якасьці работы.

Забясьпечэньне настаўнікаў прадуктамі харчаваньня і прамтаварамі павінна праводзіцца ў наступным парадку: у гарадох і прамысловых раёнах праз прымацаваньне да закрытых рабочых разьмеркавальнікаў і сталовых на нормах прамысловых рабочых; забясьпечэньне настаўнікаў у калгасах харчовымі прадуктамі праводзіць з харчовых фондаў калгасаў па нормах прамысловых рабочых данага раёну; забясьпечэньне сельскіх настаўнікаў прамтаварамі і прадуктамі прамысловай вытворчасьці, а таксама забясьпечэньне настаўнікаў прадуктамі харчаваньня ў сёлах, дзе яшчэ няма калгасаў, праводзіць з фондаў цэнтралізаванага забясьпечэньня па нормах прамысловых рабочых данага раёну. Ра ўсёй рабоце сярод настаўніцтва ўсямерна разьвіваць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, усімі мерамі заахвочваючы настаўнікаў-ударнікаў.

4. Матар'яльная база пачатковай і сярэдняй школы

Адзначаючы, што матар'яльная база школ—пабудова новых будынкаў, рамонт існуючых, вытворчасьць навучальнага абсталяваньня і навучальных прыладаў—вельмі недастаткова і становіцца адным з перашкод да палепшаньня работы школ, ЦК прапануе Дзяржпляну Саюзу распрацаваць пяцігадовы плян новага школьнага будаўніцтва. Лічыць абавязковым на ўсіх новых будаўніцтвах сканчэньне будаўніцтва школ да пачатку работ прадпрыемства.

У мэтах пашырэньня фонду школьных памяшканьняў ЦК прапануе мясцовым партыйным і савецкім арганізацыям забясьпечыць зварот школам неаслабанёных былых школьных памяшканьняў, а таксама скарыстаньне для школ канфіскаваных кулацкіх дамоў. Неабходна шырока прыцягнуць ініцыятыву і сродкі калгасаў да справы палепшаньня матар'яльнай базы школы і палепшаньня забясьпечэньня настаўніцтва.

ВСНГ стварыць Усесаюзнае аб'яднаньне прамысловасьці, вырабляючай навучальнае і школьнае абсталяваньне і навучальныя прылады, разглядзеўшы ў 2-месячны тэрмін вытворчы плян гэтага аб'яднаньня, з такім разьлікам, каб ужо ў 1932 годзе асноўная маса як пачатковых, так і сярэдніх школ была забясьпечана неабходным мінімумам навучальнага абсталяваньня. Наркамасьветам саюзных рэспублік у месячны тэрмін склесьці адпаведную заяўку і прадставіць у ВСНГ, распрацаваўшы стандарты навучальных прылад і політэхнічнага абсталяваньня.

Запрапанаваць ВСНГ СССР перадаваць у школы станкі, інструманты і розныя адыходы (брак, лом, шмацьцё), якія ня могуць быць скарыстаны на прадпрыемствах але здатныя для рабочых пакояў школьных майстэрняў. Саўнаркомам саюзных рэспублік, край і аблвыканкомам і органам прамкаапэрацыі ў найкарацейшы тэрмін арганізаваць выраб на мясцох навучальных прылад і навучальнага абсталяваньня для мясавай школы, скарыстаўшы ў гэтых мэтах мясцовыя рэсурсы.

5. Кіраваньне і кіраўніцтва школаю

Адзначаючы дасягнутыя за апошнія гады Наркамасьветамі саюзных рэспублік посьпехі па перабудове ўсёй сваёй арганізацыйнай работы, ЦК партыі падкрэсьлівае, што палепшаньне якасьці работы школы немагчыма без рашучага падвышэньня якасьці кіраўніцтва школай з боку органаў Наркамасьветы, хутчэйшага пераходу іх да апэрацыйнага, канкрэтнага і дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва, з улікам гаспадарчага і палітычнага значэньня асобных вобласьцяў і раёнаў, нацыянальных асаблівасьцяй і г. д., з устанаўленьнем ва ўсіх зьвеньнях народнай асьветы строгай, выключаючай абязьлічку, адказнасьці за даручаную работу. ЦК патрабуе ад усіх органаў народнай асьветы работы і кіраўніцтва па-новаму, адпаведна ўзросшым патрабаваньням, як'я прад'яўляе да школы сацыялістычная рэканструкцыя народнай гаспадаркі.

ЦК прапануе Наркамасьветам саюзных рэспублік рашуча перабудаваць практыку кіраўніцтва органаў народнай асьветы, зрабіўшы яго сапраўды апэрацыйным і дыфэрэнцыяваным, згрупаваўшы ўвагу на важнейшых прамысловых раёнах (мэталь, вугаль, нафта і г. д.), саўгасах, МТС, раёнах суцэльнай калектывізацыі і новых будаўніцтвах. Ліквідаваць «ураўніцельны» падыход у разьмеркаваньні сіл і сродкаў, канцэнтруючы іх перш за ўсё на вядучых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Наркамасьветам саюзных рэспублік забясьпечыць ажыцьцяўленьне адзінага начальля ў кіраванні школаю. Прафсаюзным арганізацыям аказаць у гэтай справе неабходную дапамогу органам народнай асьветы.

Наркамасьветы саюзных рэспублік павінны, арганізуючы практычную дапамогу настаўнікам у іх рабоце, павялічыць адказнасьць настаўніцтва за якасьць школьнай работы, выдзяляючы і заахвочваючы перадавых і ведаючых сваю справу настаўнікаў.

Паставіць работу органаў дзіцячага самакіраўніцтва ў школе такім чынам, каб яна была галоўным чынам накіравана на падвышэньне якасьці вучобы і ўзмацненьне сьвядомай дысцыпліны ў школе.

ЦК лічыць, што для пасьпяховага ажыцьцяўленьня паставленых гэтай пастановай задач Наркамасьветы саюзных рэспублік павінны павесьці рашучую барацьбу з тымі элемэнтамі ў органах народнай асьветы, якія супрацьпяюцца павароту ў рабоце ў напрамку, які паказвае гэтая пастанова, замест падвышэньня якасьці навучаньня, альбо захапляюцца лявацкай фразай, альбо цягнуць назад да буржуазнай школы.

ЦК падкрэсьлівае ўзрастаючае значэньне і ролю школы ў сацыялістычным будаўніцтве, ЦК прапануе ўсім арганізацыям весьці сыстэматычную і няўхільную барацьбу супроць апартуністычных антыленінскіх скажэньняў політыкі партыі ў галіне школьнай работы. Посьпех барацьбы з галоўнай небясьпекай на шляху пабудовы політэхнічнай школы, з правапартуністычнымі скажэньнямі політыкі партыі, вядучымі да адмаўленьня ад політэхнізацыі школы, да спроб захаваньня старой, славеснай школы, да разрыву паміж тэарэтычным навучаньнем і практыкай, міркуе пасіленьне барацьбы з леваапартуністычнымі скажэньнямі, з тэорыямі «адміраньня школы» і зьніжэньня ролі настаўніка.

ЦК зварочвае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый на неабходнасьць рашучага ўзмацненьня ўвагі масавай школе, рабоце настаўніка і ўзмацненьню штодзённага канкрэтнага кіраўніцтва школай.

ЦК УсеКП(б).

ПРАЦОЎНЫЯ ГОРАДУ І ВЕСКІ!

Да вас зварачаюцца з па-за крат фабрык сьмерці рэвалюцыйныя вязьні польскага фашызму:

— На кожным кроку сваей барацьбы памятуйце аб сваіх зьняволеных братох, масавымі протэстамі падтрымлівайце нашу барацьбу з турэмным рэжымам!

— Усе як адзін уступайце ў шэрагі МОПР'у—зьбірайце дапамогу для палітзьняволеных грашыма і вопраткай

„Нас катуюць так, як умее катаваць—толькі польская дэфэнзыва“

Ліст палітзьняволенага Лукіскага вастрогу

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Фашыстаўскі ўрад ня толькі душыць працоўныя масы беззямельтся, выцісканае апошнія сілы і морыць голадам, але тых, якія дамагаюцца хлеба і працы кідае на доўгія гады ў астрогі. У вастроге паны заводзяць такі гібельны лад, каб нас барацьбітоў зганяцьць навольнай сьмерцю са сьвету, альбо зламаць нашу рэвалюцыйную волю. Толькі-ж фашыстам гэта ня ўдасца, зламаюць яны зубы аб сталёвае адзінства барацьбы ўсіх палітычных вязьняў і салідарную барацьбу працоўных мас фабрык і вёсак.

Банда фашыцкіх катаў уздумала адабраць ад усіх нашых таварышоў у Лукіскай турме тыя правы, якіх мы дабіліся ў крывавай барацьбе з турэмнай адміністрацыяй. У адказ на гэта 4 ліпеня мы ў ліку 190 абвясьцілі галадоўку і рашылі лепш памерці ў барацьбе, чым паддацца ворагу. Нас мучылі так, як толькі ўмее мучыць польская дэфэнзыва: катавалі, калечылі, гвалтам кармілі, кідалі ў цёмныя карцары, закоўвалі ў кайданы—рабілі ўсё, каб зламаць супраціўленьне галадуючых. Маладая дзяўчына Х. Цэйтэль пасьля катаваньня зусім спаралізавана, яна пры сьмерці.

У горадзе рабочыя беспрацоўныя сталі ў абароку нас. Пад астрогам каля суду і ў іншых пунктах гораду адбыліся дэманстрацыі пратэсту, у часе якіх дайшло да вострых сутычак з паліцыяй; на фабрыках Шапіра і Навагрудзкага адбыліся двохгадзінныя забастоўкі пратэсту.

Пад націскам барацьбы мас і нашай стойкасьці фашыстаўскія ўлады пайшлі на подлае ашуканства і абяцалі галадуючым задаволеньне ўсіх іх дамаганьняў. Тады мы на 10-ты дзень галадоўку спынілі. А на другі дзень турэмная адміністрацыя абвясьціла, што ніякіх уступак яна ня робіць. Наадварот, замест двохгадзіннага шпацару (пратулкі), цяпер мы маем толькі паўгадзіны і іншыя пагоршаньні.

Як бачыце, фашыстоўская сволач, прыціснутая да сьценкі, выкручваецца рознымі ашуканствамі і хітрыкамі, каб зламаць рэвалюцыйную барацьбу рабочых і сялян. Правакатарская здрада на Лукішках лішні раз даказвае, што пакуль не пераламаем храбет фашыстоўскаму ладу да тых пор ня будзе жыцьця.

Таварышы сяляне! Вам цяжка жывецца ў Польшчы—гэтай турме народаў, але нам адарваным ад нашага супольнага чырвонага фронту і кінутым у каменныя мяшкі,—гэтай турмы ў турме,—нам заглядае ў вочы мучаніцкая сьмерць.

Дык на кожным кроку сваёй барацьбы памятайце аб сваіх зьняволеных братох, масавымі выступленьнямі падтрымлівайце нашую барацьбу, вызваляйце нас з фашыстаўскіх каршуновых кіпцяў, зьбірайце дапамогу грашмі, вопраткай, харчам. Уступайце ўсе грамадою ў МОПР.

„Ня можам маўчаць, калі над намі зьдзекуюцца, б'юць, катуюць!“

Дарагія таварышы!

Слонімская турма, у якой мы сядзім, гэта магіла для жывых людзей. Пасадзілі нас у сырую камеру № 2. Места ў гэтай камеры ня больш як на чалавек—8-10, а нас пасадзілі ўсіх 36 чалавек. Камера для нас зусім малая і адно маленькае акно, такім чынам мы ўсе задыхаемся. Цэлы дзень прыходзіцца стаяць на нагах: няма нідзе ні прысесьці ні легчы. Ноччу яшчэ горш: на нарах—ня кажучы ўжо аб сеньніках і палова нас ня можа зьмясьціцца, ноч гадамі цягнецца, няма дзе легчы. Мы ня сьпім. А на голай цэмэнтнай падлозе немагчыма і паўгадзіны пражыць. Такім чынам нам прыходзіцца класьціся амаль адзін на аднаго і гэтак ляжаць. Заснуць нельга, кожны стараецца як найменш заняць мейсца каб даць свайму таварышу прылегчы. Гісторыя барацьбы, вопыты перадаюцца з вусн у вусны. Вучымся без кніжак.

Харчы, якімі нас корміць адміністрацыя вастрога—толькі для павольнага выміраньня. Раніцой камок на хлеба, а хлебнага цеста у абрэзку 400 грам, і літр так-званай кавы, якая пасьля, як астаіцца—дык на дне застаюцца прыжарэлыя і буйнаязьмеленыя зярняты, а на версе сьветлая вада. Абед складаецца з цёплай вады глінянага колеру, а на дне міскі распараная размокшая ў вадзе гародніна, сухая капуста, гарох, крупіна, сярод гэтай гушчы нямала мышыных адходаў. На вячэру даюць тое самае. Бялізну зьмяняем два разы на месяц. У лазьню ходзім толькі раз. Ды прызнацца калі холадна, мы ў сваю лазьню баяліся хадзіць. Там нельга найці каплі цёплай вады. Такое жудаснае становішча, у якім мы знаходзімся, надта спрыяе разьвіцьцю вашэй. Уперад мы з імі змагаліся—нішчылі, а зараз не ўпраўляемся, ад нэрву трасуцца рукі. Далей мы цярпець гэтага не маглі. Парашылі выкліць прарурора. Пракурор прыйшоў, але на нашы жалабы—абурыўся. Мы ў падарак аддалі яму поўную скрынку вошай. Няхай ведае якое наша становішча.

Кінуць сілы на фронт сяўбы

Зацяжка сяўбы, зрыў зяблева—удар па ўраджайнасьці сацыялістычных палёў

Рашуча зьнішчыць шкодныя традыцыі—„сеяць да самага Пакрава". Максымальна нагрузіць машыны, правільна расставіць сілы і на аснове зьдзельшчыны ўзьняць уверх крывую сяўбы

Досыць спадзявацца на самацёк

Аршаншчына да сяўбы не падрыхтавалася

Па **Аршанскім** раёне згодна пляну павінна быць сёлета засеяна 30.292 га азіміны, з якіх жыта 29,325 га, пшаніцы—868 га і кудлатай вікі—36 га.

25-га жніўня павінна была быць скончана сяўба азіміны па раёне, але на 24-га жніўня распачалі сяўбу толькі некаторыя калгасы: **Кудаеўскага, Варывашанскага і Межанскага** сельсавету. Факты з месц сыгналізуюць аб вялікім прарыве на гэтым адказным вучастку работы.

Рад сельсаветаў—**Какаўчанскі, Пугляеўскі, Крапівенскі**—яшчэ ня толькі не пачалі сяўбу, але нават як сьлед не падрыхтаваліся да яе.

Райкалгассаюз, Райза слаба кіруюць гэтай справай. Штучнае ўгнаеньне марынуецца на складах і базах. Райкалгассаюз абмежаваўся рассылкай разнарадак па калгасах і зусім не клапоціцца аб тым, каб прасунуць угнаеньне да гаспадарак.

Райкалгассаюзы і Райза да гэтага часу не ўзгадніі кантрольных плянаў па правядзеньні вапнаваньня і тарфаваньня глебы і правядзеньні іншых агратэхнічных мерапрыемстваў. Па сельсаветах, якія далучаны да раёну пасьля ўзбуйненьня, прыгатаваны торф для тарфаваньня глебы не скарыстоўваецца.

Яшчэ горш абстаіць справа па аднаасобным сэктары, які яшчэ займае 40 проц. усяе плошчы па раёне. Райза зусім ня кіруе сяўбой па аднаасобным сэктары. У радзе месц да гэтага часу не падняты нават папар.

Трэба неадкладна ліквідаваць прарыў на фронце асеньняй сяўбы па Аршаншчыне.

Партыйныя, камсамольскія і савецкія арганізацыі павінны мабілізаваць усю грамадзкасьць на ліквідацыю гэтага прарыву. Трэба пакласьці канец апартуністычнай бязьдзейнасьці, стаўцы на самацёк і сапраўды стаць на чале кіраўніцтва асеньняй сяўбой. Плян выкананьня сяўбы павінен быць выканан у тэрмін.

А—к.

Пра ход уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Земляробства аб ходзе ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, СНК БССР адзначае, што сяўба азімых культур, уборка яравых, ворыва на зяб і сіласаваньне кармоў праходзіць нездавальняюча і асабліва адстаюць Віцебскі, Чашніцкі, Асьвейскі, Вушацкі, Нараўлянскі і Прапойскі раёны.

Выходзячы з гэтага, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, пад адказнасьць іх старшынь, ужыць усе захады да неадкладнага разгорнваньня сяўбы азімых культур і правядзеньня яе ў максымальна-кароткія тэрміны.

Прапанаваць упаўнаважанаму Беларускага Аддзяленьня Трактарацэнтру т. Каршакевічу, дырэктарам усіх саўгаспстрэстаў і машына-трактарных станцый дабіцца заканчэньня сяўбы не пазней як праз дэкаду і пасьля заканчэньня сяўбы пераключыць усю цягавую сілу і трактарны парк на поўнае выкананьне пляну ворыва на зяб і асабліва на падняцьце цаліны.

2. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты скончыць уборку сенажаціў другога ўкосу не пазней 25 верасьня, рашуча ўзмацніўшы работу па апэрацыйным кіраваньні і кантролю за выкананьнем саўгасамі, калгасамі і аднаасобнікамі вызначаных плянаў сіласаваньня кармоў, скарыстоўваючы для гэтага бульбяную батву, пасеяныя культуры для сілосу—кукурузу, клаверніч, балотныя травы і інш.

3. Адзначаючы, што некаторыя раёны да гэтага часу не далі вестак аб ураджайнасьці гэтага году, што не дае магчымасьці ўстанавіць выкананьне пляну па падняцьці ўраджайнасьці, даручыць раённым выканаўчым камітэтам абавязкова скласьці канчатковую ацэнку збожжавых культур па становішчы на 1-IX—31 г., а па тэхнічных культурах да 1-X—31 г. і падаць у Народны Камісарыят Земляробства па тэлеграфу па збожжавых культурах не пазней 15-IX—1931 г., а па тэхнічных культурах і па бульбе не пазней 1-X—1931 г.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **Г. Грысевіч.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

6 верасьня 1931 г.

г. Менск.

Пухавіцкі РВК яшчэ не адвёў зямлі пад азімы клін

Па **Рудзенскім** сельсавеце, Пухавіцкага раёну, да апошняга часу няма яшчэ плянаў асеньняй сяўбы. Калгасам **«Чырвоная Зьмена», «Бязбожнік»** і **«Чырвоны Спэцыяліст»** не адведзена яшчэ зямлі пад азімы клін. Таксама не адведзена зямля пад жыта аднаасобнікам пасёлкаў: **Крыніца і Рудзенск № 2.**

Пляны сяўбы не абгаварваюцца на сходах. Кулацкім гаспадаркам ня вызначаны цьвёрдыя заданьні па сяўбе.

Зернаачышчальныя машыны стаяць без работы. Да ачысткі насеньня ня прыступлена. Сельсавет ня прымае ніякіх захадаў да таго, каб калгасы і аднаасобнікі сеялі ачышчанае насеньне.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністах з Пухавіцкага РВК і Рудзенскага сельсавету, якія зрываюць плян асеньняй сяўбы.

Р. Асака.

Выкарыстаць попел наўгнаеньне

Калгас **«Ударнік»** не выкарыстоўвае попел на ўгнаеньне.

Яшчэ ўвесну прывезьлі з Абчугскай цьвіковай фабрыкі значную колькасьць попелу, які ня быў выкарыстан у часе веснавой сяўбы.

Таксама не выкарыстан і супэрфасфат. Сотні цэнтнераў каштоўнага ўгнаеньня не скарыстоўваюцца. Кіраўніцтва калгасу павінна зараз-жа выкарыстаць усё мінэральнае ўгнаеньне пад жыта.

Г. Лапіцкі.

Сяўбу праводзім па ўдарнаму

Калгас «Новыя Русакі», Гарадзішчанскага сельсавету, Шклоўскага раёну па ўдарнаму праводзіць сяўбу азіміны.

З вялікім захапленьнем узяліся калгаснікі за работу. На аснове зьдзельшчыны калгаснікі перавыконваюць норму выпрацоўкі.

За 2 дні калгас засеяў 17 з палавой га жыта. Сяўцы перавыконваюць нормы. Замест 2 га за адзін працадзень засяваюць 3 з палов. га.

Т.

Абязьлічка, ураўнілаўка і самацёк дэзарганізавалі работу МТС, нагрузка трактароў не дасягае 30 проц.

Старыя Дарогі. (Белта). Апартуністычная практыка кіраўніцтва **Старадароскай** МТС прывяла да простага шкодніцтва. Працаздольнасьць некаторых трактароў зьнижана амаль на 90 проц. Прычынай гэтаму зьяўляецца абязьлічка. Трактарысты не адказваюць за трактар. Усюды наглядаюцца недапушчальныя адносіны па догляду за трактарамі.

Псаваньне трактароў даходзіць да 50 проц. Па некаторых калгасах трактары стаяць паржавеўшымі і на іх ніхто не зьвяртае ўвагі.

Нагружанасьць трактароў не дасягае нават 30 проц. У часе веснавой сяўбы былі выпадкі, калі трактары мелі нагрузку 0,92 га.

Да сяўбы азіміны МТС не падрыхтавалася. Дырэктар МТС нават ня ведае колькі трэба будзе ўзьмяшаць пад жыта. Прамфінпляну станцыя ня мае. Таксама МТС нічога ня ведае колькі каштуе апрацоўка аднаго га.

Перавыдаткі гаручага дасягаюць 50 і больш проц. Зьдзельшчына зусім ня ўжываецца. Вучоту працы няма. Ніхто ня ведае колькі хто выпрацоўвае. Ураўнілаўка зьвіла сабе тут моцнае гняздо. Дзякуючы ўсяму гэтаму наглядаецца цякучасьць рабочага складу.

МТС не вядзе масавай работы сярод беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў, ня мае сувязі з калгасамі. Кулацтва выкарыстоўвае гэты момант, таворачы, што на конях лепш працаваць чым на трактарах, што ад трактара жыта парасьце дрэнна. Кулацкай агітацыі ніхто не дае рашучага адпору.

Патрэбна тэрміново аздаравіць Старадароскую МТС.

Адсутнасьць зьдзельшчыны, абязьлічка—галоўныя прычыны зрыву сяўбы

Сяўба азіміны па **Плешчаніцкім** раёне зусім не разгарнулася. Да 1-га верасьня павінна была быць скончана сяўба, між тым на гэты тэрмін па раёне было засеяна толькі 32 га жыта.

У радзе калгасаў нават не заскароджаны папар (калгасы імя Фрунзе Горкаўскага сельсавету і імя АДПУ, Каменскага сельсавету).

Такі прарыў у правядзеньні сяўбы азіміны зьявіўся ў выніку адсутнасьці зьдзельшчыны па калгасах і наяўнасьці абязьлічкі. У калгасе імя АДПУ 60 проц. коней выбыла са строю, бо за імі неарганізаваны належны догляд, яны не прымацаваны да пэўных асоб.

Вапнаваньне глебы сарвана. Замест 2.439 тон вапны завезена толькі 5 тон. Зрываецца плян і па штучным угнаеньні, замест 518 тон угнаеньня размеркавана толькі 262 тоны, а вывезена —82 тоны. Райкалгассаюз зусім не цікавіцца пытаньнем падвышэньня ўраджайнасьці палёў.

Плян сяўбы азіміны па Плешчаніцкім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. РайРСІ павінна тэрміново ачысьціць Райкалгассаюз ад апартуністаў, па віне якіх зрываюцца ўсе мерапрыемствы па асеньняй сяўбе.

В. Бабкоў.

На Вушачыне зрываецца сяўба азіміны

Сеялкі стаяць без работы

Асеньняя сяўба па **Вушацкім** раёне пачалася толькі 28 жніўня і то па 5 калгасах. Рэшта калгасаў да сяўбы яшчэ не падрыхтавалася.

Нічога ня робіцца для таго каб мэханізаваць сяўбу. Рад калгасаў адмаўляецца браць радкавыя сеялкі. Бываюць выпадкі калі стаяць без работы 12-радкавыя сеялкі.

Райкалгассаюз, Райза, сельсаветы і калгасы павінны рашуча пераключыцца на ўдарнае правядзеньне асеньняй сяўбы. У кожным сельсавеце неабходна арганізаваць «дошку тэмпаў». Не пазней 10 верасьня сяўба азіміны па Вушачыне павінна быць закончана.

К. Кароль.

У гэтых сельсаветах ня ўсё добра

(З лістоў рабселькораў)

⊙ Ня выдаецца насьценная газэта ў Ручаеўскім сельсавеце Лоеўскага раёну. Старшыня сельсавету, як відаць ня любіць крытыкі і самакрытыкі, а крытыкаваць ёсьць за што. Да асеньняй сяўбы і кампаніі загатовак сельсавет не падрыхтаваўся, рэалізацыя пазыкі «3-га рашаючага году» праходзіць самацёкам. Сельсавет ня прымае ніякіх мер узмацненьня гэтай работы.

Вока.

⊙ Заняпала работа Люксэмбурскага нямецкага нацсавету Ельскага раёну. Сельсавет у рабоце зьяўляецца самым адсталым па калектывізацыі (калектывізавана 9 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак). Да новага навучальнага году падрыхтоўка ў сельсавеце не разгорнута. Школы не адрамантаваны. Вучоту дзяцей, якія падлягаюць абавязковаму ўсеагульнаму навучаньню ў сельсавеце няма.

Г. і Н.

⊙ Разбураецца млын, які належыць калгасу «Чырвоны Пруд» Кармянскага раёну. Млын даўно патрабуе капітальнага рамонту, але рамонт ня робіцца. Праўленьне калгасу ня думае аб рамонце млыну, у той час як гэты млын пры правільным скарыстаньні яго дае вялікі даход калгасу.

П. Цыкуненка.

⊙ Член Арэшкаўскага сельсавету Андрыевіч агітуе беднату і калгаснікаў супроць сустрэчных плянаў загатовак дроў і лесу. Андрыевіч зьяўляецца па сваім сацыяльным становішчы кулаком, але дзякуючы таму, што ён зна ходзіцца ў добрых адносінах са старшынёй сельсавету — ён да гэтага часу яшчэ не абкладзены індывідуальна.

Мятла.

Выкорчаваць апартуністычныя адносіны да загатоўкі малочных прадуктаў

Спыніць разбазарваньне малака і масла. Спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулакоў

Зрыў загатовак малочных прадуктаў—удар па рабочым забясьпечаньню

8 месяцаў загатоўчага сэзону малочных прадуктаў поўнасьцю паказалі не падрыхтаванасьць загатоўцаў да гэтай кампаніі. Паказальнікі выкананьня загатовак сыгналізуюць аб пагражаючым становішчы ў гэтай галіне работы. За пэрыяд студзень-красавік загатоўкі малакопрадуктаў па БССР літаральна былі правалены. За чатыры месяцы паводле тэарэтычных разлікаў павінна было паступіць малочных прадуктаў у пераводзе на цэльнае малако 19-20 проц. у адносінах да гадавога пляну, а ў сапраўднасьці паступіла 6 з палов. проц.

Май-чэрвень месяцы, праўда, далі зрух у загатоўках малакопрадуктаў, але прынесьці гэты зрух здавальняючым ні ў якім разе нельга, бо выкананьне пляну загатовак за гэтыя два месяцы ня толькі не пакрыла недавыкананьне плянаў папярэдніх месяцаў, але плян на гэтыя месяцы таксама недавыкананы.

Загатоўкі за май і чэрвень месяцы павінны скласьці 34 проц. гадовага пляну, аднак выкананьне пляну паводле даных вытворчай справаздачнасьці за гэты пэрыяд складае ўсяго 17,9 проц. гадовага пляну.

У чэрвені месяцы па пляну павінна было паступіць у пераводзе на цэльнае малако 27,7 тысяч тон малакопрадуктаў, паступіла-ж усяго 8 тысяч тон, што складае толькі 28,9 проц. да месячнага пляну.

Усяго на 20 жніўня выкананьне пляну загатоўчымі арганізацыямі ў процантах складае наступнае: па Белхлебжывёлсаюзу 33,9 проц., Белкаапмалако 49,7 проц., Белсельтрэсту—22,2 проц., Сьвеінаводтрэсту 31,7 проц., Насенаводтрэсту—11,7 проц., Маслатрэсту 15,5 проц., Ільняленькатрэсту 24,9 проц. МТФ ЦРК 20,2 проц. Такім чынам на 20 жніўня гадавы плян выкананы на 36,5 проц.

Калі прыведзеныя лічбы і не зьяўляюцца зусім поўнымі, ўсё-ж такі трывога за выкананьне пляну не павінна зьмяншацца. Маслазагатоўкі стаяць перад сур'ёзнай пагрозай зрыву. На мясцох яшчэ наглядаецца выпадкі разбазарваньня малакапрадукцыі. Саўгасы яшчэ бяруць сабе лявіную долю малакапрадуктаў з гаспадарак. Напрыклад саўгас Уваравічы (БСТ) за ліпень месяц загатовіў 26,4 тоны малака, з якіх здаў дзяржаве 11,3 тоны, рэшту выдаткаваў на месцы; саўгас Брылёў (БСТ) загатовіў малака 9,7 тоны, а здаў 3,8; саўгас Натальеўск (БСТ) загатовіў 9,8 тоны, здаў 4,5 тоны. Калі падлічыць, дык процант асяданьня малака ў саўгасах значна перавышае ўстаноўлены, пры чым факты перавыдаткаваньня малочных прадуктаў унутры гаспадаркі вельмі частае зьявішча.

Шмат калгасаў зусім не закантрактавалі малака і не здаюць яго. Выкананьне цьвёрдых заданьняў па загатоўках малака кулацкім гаспадаркамі за паўгодзьдзе складае ўсяго 2,6 проц. Такія адносіны загатоўчых органаў да загатовак малакопрадуктаў нельга назваць інакш як апартуністычнымі.

Районабы, як гэта паказалі абсьледваньні інспэктароў Саюзмалако таксама апартуністычна спадзяюцца на самацёк у загатоўках малочнай прадукцыі.

У рабоце па правядзеньні загатовак малочнай прадукцыі павінен быць зроблен крутэ пералом.

Загатоўчыя арганізацыі на мясцох павінны зараз-жа рашуча ўзмацніць сваю работу. Вакол загатовак малакопрадуктаў трэба мабілізаваць больш увагі эдатчыкаў. Трэба рашуча ліквідаваць «благадушныя» адносіны да кулака, які злачынна ня выконвае цьвёрдых заданьняў. На мясцох трэба павесьці рашучую барацьбу супроць разбазарваньня малака.

Пляны загатовак малочнай прадукцыі рэальныя, яны павінны быць выкананы і пры дастаткова праведзенай рабоце яны будуць выкананы.

П. К.

Малочныя прадукты—важнейшая галіна загатовак

Белхлебжывёлсаюз гадавы плян загатовак малакапрадуктаў на 10-VIII-гп. выканаў усяго на 31,8 проц. Такія раёны, як Асіпавіцкі, Барысаўскі, Заслаўскі, Мазырскі, Лельчыцкі, Пухавіцкі, Прапойскі, Рагачоўскі, Жлобінскі, Хойніцкі і Чэрыкаўскі зусім ганебна адстаюць у выкананьні сваіх плянаў.

Такі нізкі процант выкананьня пляну тлумачыцца галоўным чынам тым, што да гэтага часу большасьць райкалгассаюзаў не зразумелі ўсёй важнасьці і неабходнасьці выкананьня плянаў загатовак малакопрадуктаў.

Яшчэ да гэтага часу не наладжаны штодзённы кантроль і праверка выкананьня кантрактантамі сваіх абавязацельстваў і асабліва выкананьня кулацка-заможнымі гаспадаркамі даведзеных ім цьвёрдых заданьняў. Такое становішча пагражае поўным зрывам загатоўчых плянаў.

Белхлебжывёлсаюз абвясьціў па сваёй сыстэме з 25-VIII па 15-IX гг. двухдэкаднік па ўзмацненьні здачы малака. Райкаапсаюзы на працягу бліжэйшых 3-х дзён абавязаны накіраваць у раён работнікаў для праверкі выкананьня кантрактантамі сваіх абавязацельстваў, спагнаньня цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак, надаўшы гэтаму мерапрыемству шырокі масавы характар.

Раённыя партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны ўключыцца ў двухдэкаднік і дапамагчы Райкаапсаюзам узмацніць прыток малака прадуктаў у рабочыя цэнтры.

М. С.

Сацспаборніцтва—лепшы мэтад загатоўчай работы

У мэтах больш пасьпяховага правядзеньня загатоўчай кампаніі, калектыў супрацаўнікоў. Хойніцкай канторы «Белсадгародніна» абвясьцілі сябе ўдарнікамі і выклікаюць на сацспаборніцтва работнікаў канторы «Белсадгародніна», Жлобінскага раёну, па наступных галінах работы:

1. Перавыкананьне пляну загатовак гароднины.

2. Выкананьне дырэктывы партыі і ўраду аб забесьпячэньні рабочых цэнтраў добраякаснай прадукцыяй.

3. Дамагчыся самых лепшых адносін да эдатчыкаў прадукцыі і не затрымліваць лішняга часу падвод.

4. 100-проц. скарыстоўваньне адыходаў прадукцыі.

5. Сваячасовая дача заявак на вагоны, не дапускаючы прастояў іх.

6. Абсталяваньне вагонаў такім чынам, каб адпраўленая прадукцыя не псавалася.

Гібхін.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 207 (3296)

Афармленьне падпіскі і ўтрыманьне ўзносаў—БАЯВАЯ ЗАДАЧА

Сельсаветы павінны змагацца за ліквідацыю адставаньня па аднаасобным сэктары

Віцебск здае тэмпы

Віцебск. (Наш кар.) Пралетарыят Віцебска, перавыканаў плян рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы». Аднак з гэтай задачай—выкананьне і перавыкананьне кантрольнага заданьня—рабочыя Віцебску справіліся з гонарам, дзякуючы ўдарным тэмпам работы і мабілізацыі на гэту справу шырокіх мас, дык зусім нездавальняючае становішча і нават апартуністычную недацэнку мы маем па афармленьні падпіскі і ўтрыманьні ўзносаў за пазыку. Прыкладам гэтага могуць служыць **фабрыка «Дзьвіна»**, якая з рэалізаваных сярод рабочых 76.065 руб. пазыкі аформіла толькі 51.000 руб., **фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі»**, якая утрымала з рабочых 27.000 руб.—ня ўнесла іх у ашчадкасу, групком будаўнікоў № 22, які рэалізаваў на пазыкі на 8.410 руб., а ўнёс... 55 руб. 50 кап.

Такіх прыкладаў апартуністычных адносін да афармленьня падпіскі і ўтрыманьня ўзносаў можна падаць шмат. Такое становішча з афармленьнем падпіскі і ўтрыманьнем узносаў прымушае біць трывогу, аб тым, што камсоды на мясцох пасьля правядзеньня падпіскі супакоіліся і ніякай растлумачальнай работы аб сваячасовым утрыманьні ўзносаў на пазыку не праводзяць.

Побач з гэтым камісіі садзейнічаньня на мясцох у сваёй большасьці не праводзяць ніякай растлумачальнай работы па ахопе падпіскай на пазыку новых рабочых, сэзоньнікаў і старых рабочых, якія яшчэ не падпісаліся. Вынікам гэтага зьяўляецца тое, што каля 400 рабочых фабрыкі «Дзьвіна», 700 рабочых на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» і каля 50 проц. будаўнікоў спэцбудаўніцтва падпіскай не ахоплены.

З такімі апартуністычнымі адносінамі да справы рэалізацыі пазыкі, да справы выкананьня фінпляну трэба рашуча змагацца.

Камісіям садзейнічаньня неабходна зараз-жа ажывіць сваю работу па 100-процантным ахопе падпіскай на пазыку ўсіх новых і старых рабочых, сэзоньнікаў, а таксама дамагчыся 100 проц. афармленьня падпіскі і сваячасовага ўтрыманьня ўзносаў.

Асаблівая ўвага на рэалізацыю пазыкі павінна быць зьвернута партканклектывам, фабкомам і камісіям садзейнічаньня фабрыкі «Дзьвіна», дзе ў галіне рэалізацыі пазыкі маецца вялікі прарыў.

Шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж камсодамі, прадпрыемствамі, брыгадамі, цэхамі, узяцьцем на буксір перадавымі адстаўных і правядзеньнем шырокай растлумачальнай работы аб значэньні пазыкі—прарыў павінен і будзе ліквідаваны.

Н. Дварсон.

Перадавыя калгасы Глінскага сельсавету павінны ўзяць на буксір калгас імя Молатава

Калгасы Бягомльскага раёну шчыра адгукнуліся на выпуск пазыкі «3-га рашаючага году». Некаторыя калгасы Бягомльскага сельсавету, як напрыклад, «Чырвоны Араты» рэалізавалі пазыку на 550 руб. больш 3-х тыднёвага заработку, калгас «Чырвоны Дубавік» на 510 руб., калгас **Глінскага сельсавету** «Чырвоны Пушілавец» на 400 руб.

Але ў гэтым сельсавеце маецца калгас імя тав. **Молатава**, які на чале са старшынёй калгасу ад падпіскі на пазыку адмовіўся. Бузумоўна, што гэты калгас свайго імя не апраўдаў. Перадавыя калгасы павінны ўзяць на буксір калгас імя тав. Молатава.

Іваноў.

Старасельскі сельсавет правальвае рэалізацыю пазыкі

Старасельле. Распаўсюджаньне пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» па **Старасельскім сельсавеце, Копыскага раёну**, праходзіць самацёкам.

Старшыня сельсавету тав. **Рубанаў** пра распаўсюджаньне пазыкі амаль зусім ня дбае. **Да гэтага часу сельсавет яшчэ нічога не зрабіў, каб выканаць заданьне па рэалізацыі пазыкі.**

Масава растлумачальная работа сярод калгаснікаў, беднякоў, сераднякоў аднаасобнікаў не праводзіцца. Большасьць сялян аб пазыцы ня ведаюць. Сельсавет, партыйныя і камсамольскія арганізацыі бязьдзейнічаюць у гэтай справе.

Ударнік.

У БОЙ за папяру

аперацыйная зводка выкананьня вытворчай праграмы папяровымі фабрыкамі Б.С.С.Р.

Фабрыка „Герой Працы" (Добруш)

На 1-га верасьня паводле пляну намечана выпрацаваць паперы 111,7 тон, а фактычна выпрацавана 36,3 тоны або 32,5 проц. пляну.

На 2-га верасьня выпрацавана 39,3 тоны паперы, або 35,2 проц. пляну.

Фабрыка „Чырвоная Зорка" (Чашнік)

Выкананьне праграмы за 1-IX па вазе на накапе па ўсіх 3-х самачэрпках разам складае:

паводле пляну—44,9 тон

фактычна выпрацавана 27,8, або 62 проц.

Выкананьне праграмы за 2-IX па вазе на накапе па ўсіх 3-х самачэрпках зараз складае:

паводле пляну—44,9 тон

фактычна выпрацавана—36,8, або 81,9 проц.

Выкананьне праграмы за 3-IX:

паводле пляну—44,9 тон

фактычна выпрацавана—37,0 тоны, або 82,3 проц. да пляну.

Картонная фабрыка імя Вароўскага (Сураж-Віцебскі) паказвае ўзор работы

За 1-е верасьня фабрыка выпрацавала 6,460 тон прадукцыі, што складае 108,9 проц. пляну.

За 2-е верасьня выпрацавана—7,220 тон прадукцыі, або 121,7 проц. пляну.

Фабрыка „Спартак" (Шклоў)

За 31-VIII выпрацавана 27,145 тоны проц. да пляну—71,02 проц. да прастою—11,75.

За 1-IX выпрацавана 18,933 тоны проц. да пляну—53,68 проц. да прастою—26,38.

Ужыць тэрміновыя меры

У апошні час рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» штодзённа атрымлівае трывожныя тэлеграмы з фабрыкі «Спартак» аб тым, што Гомельскі чыгуначны вузёл і Рагачоўская чыгуначная станцыя зрываюць падачу вагонаў для адпраўкі для фабрыкі сыравіны — макулатуры і драўмасы, што пагражае спыненьнем работы фабрыкі.

Учора рэдакцыя накіравала адпаведны матар'ял у НК РСІ з просьбай тэрмінова расьсьледаваць гэту справу і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у зрыве сваячасовага забесьпячэньня фабрыкі «Спартак» сыравінай.

Падрыхтоўка пэдкадраў—баявы вучастак фронту сацыялістычнага будаўніцтва

Камсамол БССР замест 1000 мабілізаваў на пэдвучобу толькі 150 камсамольцаў. Будаўніцтва баракаў яшчэ не распачата. Прафсаюзы стаяць у баку ад падрыхтоўкі пэдкадраў

«Савецкая Беларусь» ужо пісала аб прарыве ў падрыхтоўцы да новага навучальнага году па лініі пэдтэхнікумаў і пэд. ВНУ. Заняткі з новым наборам у пэдтэхнікумах і пэд. ВНУ пачнуцца з 1 кастрычніка. Часу засталося ня так многа. 3-га верасьня рэдакцыямі газэт «Савецкая Беларусь» і «ЗКП» была склікана нарада прадстаўнікоў ведамстваў і арганізацый, якія закліканы ажыцьцяўляць падрыхтоўку пэдкадраў і дапамагаць ажыцьцяўленьню гэтай адказнай задачы.

Ня гледзячы на важнасьць пытаньня нарады—падрыхтоўка да вучэбнага году,—**на ім адсутнічалі прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і Менскага гаркому камсамолу, а таксама прадстаўнікі ЦП саюзаў мэталістаў, дрэваапрацоўшчыкаў, швэйнікаў і нархарч.** Гэта адсутнасьць яшчэ раз з усёй яснасьцю падкрэсьліла правільнасьць сыгналаў друку, што камсамол і прафсаюзы Беларусі недаацэньваюць значэньня падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў.

Асноўнай інфармацыяй на нарадзе была інфармацыя Наркамасьветы, зробленая намесьнікам наркому **таварышам Брыгневічам.**

Якое-ж становішча з падрыхтоўкай да новага навучальнага году?

Пытаньне камплектаваньня пэдагагічных навучальных устаноў працягвае заставацца напружаным. На 30-га жніўня на 9000 месц у пэд. ВНУ падана толькі 685 заяў, а з іх **ад рабочых 127 і колгасьнікаў—91.** Асабліва дрэнна справа з наборам у Гомельскім пэдінстытуце—на 220 месц маецца ўсяго 75 заяў. Ня лепш справа ў Магілеўскім і Віцебскім пэдінстытутах.

У пэдтэхнікумах за апошнюю дэкаду прыток заяў павялічыўся—на 2.080 месц маецца 1.919 заяў і апроч таго, падрыхтоўчыя курсы дадуць 700 чалавек. Такім чынам, колькасна набор у пэдтэхнікумы больш чымся забясьпечан, але якасна... З 1:919 заяў толькі 220 ад рабочых. У дашкольныя тэхнікумы на 480 месц падана 123 заявы і 13 з іх ад рабочых.

Асабліва катастрафічна стаіць пытаньне з наборам у аднагадовыя пэдкурсы—на 1.800 месц маецца каля 300 заяў. Прыкметнае палепшаньне маем з пэдрабфакамі—за апошнюю дэкаду колькасьць заяў амаль падвоілася, на 1.610 месц маецца ўжо 1.529 заяў.

Камсамольскія арганізацыі яшчэ не ўзяліся за выкананьне свайго абавязацельства—паслаць на вучобу ў пэдагагічныя навучальныя ўстановы. 1.000 камсамольцаў—**замест 1.000 на пэдвучобу мабілізавана толькі 160 чалавек.** Менская камсамольская арганізацыя з 25 чал. не дала ніводнага. **ЦК ЛКСМБ** павінен узяцца за праверку выкананьня сваіх дырэктыў нізавымі камсамольскімі арганізацыямі—абавязацельства павінна быць выканана поўнасьцю.

Паводле заявы нам. Наркамасьветы т. Брыгневіча ў Менску, Віцебску і Гомелі не хапае інтэрнатаў для студэнтаў пэдагагічных навучальных устаноў на 1.000 чал. Фактычна гэта лічба, бязумоўна, значна большая. Будаўніцтва-ж баракаў-інтэрнатаў яшчэ **не распачыналася.** Дагэтуль, ня гледзячы на дырэктывы **СНК БССР, у Менску баракі не будуюцца. Лесбел не адпускае матар'ялу, а Менбуд—кажа—у вас няма матар'ялаў, ў нас няма рабсілы і мы будаваць ня будзем.** Такі-ж прыблізна малюнак з Віцебскам і Гомелем. Такім чынам, дагэтуль рэальная пагроза, што новы набор студэнтва ня будзе забясьпечан інтэрнатамі.

Менскі Камгас ігнаруе дырэктывы ЦКК НК-РСІ аб высяленьні са школьных памяшканьняў прыватных жыхароў. Дагэтуль рабфаку БДУ не прадстаўлена належнага памяшканьня. Нельга не адзначыць тут і «дапамогу» Менскаму белпэдтэхнікуму з боку старшыні сэкцыі нарасьветы Менскага гарсавету тав. Алісевіча. Гэты таварыш для сваіх уласных патрэб захапіў частку адрамантаванага інтэрнату пэдтэхнікуму, дзе магло-б зьмясьціцца 7—8 чал.

Справа з грамадзкім харчаваньнем студэнтва ўсё яшчэ не атрымала належнага вырашэньня. Наркамасьветы супакойвае, што ў Менску, Віцебску і Гомелі харчаваньне будзе забясьпечвацца з цэнтральных фондаў, а ва ўсіх іншых гарадох і мястэчках—з мясцовых. Паводле заявы прадстаўніка прафкому БДУ—пытаньнем харчаваньня студэнтва ніхто не займаецца. Менскі ЦРК дагэтуль ня ведае—колькі студэнтаў яму прыдзецца харчаваць, хоць Наркамасьветы заяўкі даў шмат часу таму назад.

Дагэтуль у БДУ і Вышэйшым пэдінстытуце няма ніводнай праграмы,—так на нарадзе заявілі прадстаўнікі студэнтства. Бязумоўна, тут віна ляжыць на кіраўніцтве і выкладчыцкім складзе гэтых навучальных устаноў.

Як-жа дапамагаюць Наркамасьветы ў вырашэньні такой адказнай задачы, як падрыхтоўка пэдкадраў, грамадзкія арганізацыі?

Аб камсамоле мы вышэй ужо адзначалі,—дапамога яго з гэтага яскрава. Ня лепш справа і з прафсаюзамі. Прадстаўнік сэктару кадраў ЦСПСБ змог інфармаваць нараду толькі аб тым, што ЦСПСБ у свой час даў дырэктывы, сэктар кадраў праводзіў з 25 ліпеня 2-х дэкаднік штурму, але... вынікі апошняга яшчэ... прапрацоўваюцца.

«Савецкая Беларусь» ня раз сыгналізавала аб тым, што вытворчыя прафсаюзы стаяць у баку ад падрыхтоўкі да навучальнага году. Нашы ўдарныя брыгады ў часе рэйду сыгналізуючы аб гэтым, высоўвалі практычныя прапановы, але ЦП вытворчых саюзаў дагэтуль не мабілізавалі рабочыя масы на пытаньні падрыхтоўкі пралетарскіх пэдагагічных кадраў. У выніку мы маем вельмі нязначныя паступленьні заяў ад рабочых у пэдагагічныя навучальныя ўстановы.

Бюро пралетстуду працаўсьветы не павярнулася тварам да вытворчасьці,—улетку яно амаль зусім не працавала. ЦП саюзу працаўсьветы ў свой час дала нізавым прафарганізацыям асьветнікаў дырэктывы, але не праверыла, як яны выконваюцца. У выніку Менскае гарпраўленьне працаўсьветы стаяла ў баку ад падрыхтоўкі пэдагагічных навучальных устаноў да новага навучальнага году.

Нарада прызнала, што становішча з падрыхтоўкай да навучальнага году—напружаная. Вырашана ў Віцебск, Воршу, Гомель, Барысаў, Магілеў, Бабруйск і Рэчыцу накіраваць брыгадзіры для мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці гэтых гарадоў на ліквідацыю прарываў ва ўкамплектаваньні і ва ўсёй падрыхтоўцы да навучальнага году. Брыгадзіры газэт «Савецкая Беларусь», «ЗКП» і пралетстуду ўжо выехалі ў большасьць гэтых гарадоў. ЦП саюзу працаўсьветы абавязалася мабілізаваць Менскіх асьветнікаў для папулярызацыі і вярбоўкі рабочых у пэдагагічныя навучальныя ўстановы.

Пастаноўлена прасіць ЦКК НК-РСІ прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве будаўніцтва інтэрнатаў і ў нядбайных адносінах да паладжваньня грамадзкага харчаваньня студэнтва; прасіць ЦКК НК-РСІ прымусіць Менскі камгас выканаць дырэктывы аб аслабаненьні школьных памяшканьняў ад прыватных жыхароў.

Да 1-га кастрычніка засталіся лічаныя дні. Трэба напружыць усе сілы, мабілізаваць усе сродкі з тым, каб навучальны год сустрэць падрыхтаванымі, каб паслаць на вучобу ў пэдагагічныя ВНУ і тэхнікумы патрэбную колькасьць рабочых. Камсамол Савецкай Беларусі сваё абавязацельства павінен выканаць.

В.

Арганізаванымі калёнамі

СВАЯЧАСОВА НА ПРЫЗЫЎНЫ ПУНКТ!

ПРЫЗЫЎ У СТАЛІЦЫ БЕЛАРУСІ ПАЧАЎСЯ

Вопыт Менску скарыстаць гарадом і раёнам БССР

Прызыў пачаўся

У Менску—сталіцы Беларусі—прызыў пачаўся. Па астатніх гарадох і раёнах БССР ён пачнецца з 15 верасьня.

Ужо сёньня ўся падрыхтоўка да прызыву павінна была быць поўнасьцю скончана. Але гэтага няма на справе.

Матар'ялы зьмешчаныя ў «Савецкай Беларусі», «Зьвязьдзе», «Красной Звезде», «Правде» і інш. газэтах сьведчаць аб тым, што падрыхтоўка па шмат якіх раёнах БССР ня толькі ня скончылася, але ідзе вельмі марудна.

Полацак, Віцебск, Пухавічы, Петрыкаў і інш. раёны ня ўзяліся за справу як трэба.

У наяўнасьці недаацэнка гэтай вялізарнейшай палітычнай кампаніі. У наяўнасьці апартуністычныя адносіны да справы папаўненьня Чырвонай арміі клясава вытрыманымі, пісьменнымі і фізычна здаровымі байцамі.

Прафсаюзныя арганізацыі, грамадзкія, нават партыйныя ў некаторых раёнах не аддаюць патрэбнай увагі прызыву.

ЦСПСБ, Белкалгасцэнтр, на справе **зусім не цікавяцца прызывам. БКЦ не пажадаў наогул прыняць удзел у гэтай рабоце, ЦСПСБ абмежаваўся папяровымі ўказаньнямі і на гэтым супакоіўся.** Работнікі культсэктару ЦСПСБ наогул лічуць, што прызыў іх не датычыцца. «Гэтым павінен займацца масавы сэктар», так разважаюць работнікі культсэктару.

Ну, а хто-ж павінен заняцца культабслугоўваньнем?

Да гэтага часу яшчэ існуе вельмі шкодная думка аб тым, што прызыў у рады РСЧА—справа толькі Ваенведу.

Відавочна, што яшчэ ня ўсе прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі зразумелі, што **Рабоча-Сялянская Чырвоная армія не аддзіліла ад усяго пралетарыяту СССР, ад усіх працоўных саюзу.** Яны не зразумелі таго, што толькі пры ўдзеле ў прызыве шырокіх працоўных мас мы гарантуем клясава-аднастайны склад нашай слаўнай Чырвонай арміі, што толькі пры актыўнай і практычнай дапамозе з боку грамадзкіх і прафсаюзных арганізацый, Чырвоная армія атрымае пісьменнае і сьвядомае папаўненьне.

Да пачатку прызыву ў раёнах засталося толькі 7 дзён. За гэты час як рэспубліканскія арганізацыі, таксама і раённыя, павінны выправіць усе недахопы, усе памылкі ў справе падрыхтоўкі да прызыву.

ЦСПСБ, ЦС Асоавіяхіму, ЦС т-ва «Прэч няпісьменнасьць», ЦК МОПР абавязаны праверыць як на справе работаюць раённыя і мізавыя арганізацыі, павінны дабіцца таго, каб яны практычна разгарнулі масавую работу.

Па нежадаючых дапамагаць прызыўнай рабоце, па зрываючых прызыў, трэба моцна ўдарыць.

Х.

Прафсаюзы абавязаны практычна ўключыцца ў прызыў

УсеЦСПС прапанаваў усім ЦК саюзаў і СПС разгарнуць кампанію вакол чарговага прызыву ў Чырвоную армію.

Гэта кампанія павінна мабілізаваць увагу шырокіх колаў рабочай клясы на ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР на падставе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну фабрыкамі, за водамі, шахтамі, саўгасамі.

Прафарганізацыі павінны забясьпечыць поўную і своячасовую яўку на зборныя пункты ўсіх членаў прафсаюзаў, якія падлягаюць прызыву, і прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні клясавага адбору сярод прызываных.

Прафсаюзы абавязаны таксама матэрыяльна дапамагаць абсталяваньню прызыўных і агітацыйных пунктаў і разгарнуць у іх палітыка-асьветную работу. Яны-ж павінны арганізоўваць урачыстыя провады прызыўнікоў. («Красная Звезда»).

Забесьпячэньне і харчаваньне прызыўнікоў

Галоўнае кіраўніцтва РСЧА і ВКС Цэнтрасаюзу далі месцам канкрэтныя паказаньня аб арганізацыі забесьпячэньня і харчаваньня прызыўнікоў і звальняных з радоў РСЧА.

Згодна гэтых паказаньняў паёк на кожнага прызыўніка і звальняннага (1 кгр. хлеба, 150 гр. мяса і г. д.) каштуе 43 к. з гэтай сумы 30 кап. каштуе абед з 400 гр. хлеба, а астатнія 13 кап. ідуць на чай хлебам і інш.

Абед павінен быць абавязкова з двух блюд, спажыўных і добра прыгатоўленых. Акрамя гэтага павінны быць арганізаваны буфэты і ларкі для забясьпечаньня прадметамі першай неабходнасьці і дадатковымі прадуктамі харчаваньня.

Харчаваньне ў шляху павінна адбывацца ў станцыйных буфэтах. На станцыі павінны быць вывешаны абявы аб месцы знаходжаньня пунктаў, буфетаў, ларкоў і інш.

Прызыўнікі і звальняныя атрымліваюць усе тавары з буфетаў, ларкоў і ў сталоўках без чаргі. Аб атрыманьні гарачага харчаваньня на дакумантах павінны рабіцца адзнакі.

Ня спыняцца на дасягнутых выніках—ліквідаваць недахопы, паглыбіць работу

У Барысаўскім раёне мясцовыя арганізацыі ўзяліся за работу па падрыхтоўцы да прызыву своячасова і правядзяць яе наогул здавальняюча, апроч **Зембінскага і Касьцюковіцкага сельсаветаў.** Райком партыі разгледзеў пытаньне прызыву і даў адпаведныя паказаньні. Вучот дапрызыўнікоў быў наладжан добра.

Клясава-варожыя элементы своячасова выяўляліся і ўсяго адсеяна 5 проц. Нанова адрамантавана памяшканьне прызыўнога пункту, маецца дамоўленасьць з ЦРК па пытаньнях за бесьпячэньня і харчаваньня прызыўнікоў. У чырвоных кутках клюбаў і на прадпрыемствах арганізаваны выстаўкі вайсковай літаратуры.

Кампанія па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці скончана, але ў гэтай справе ня ўсё было добра. Гурткамі па ліквідацыі няпісьменнасьці былі ахоплены ня ўсе прызыўнікі. Інспэктура асьветы наогул дрэнна дапамагала ў работе ваенкамату. Прафсаюзныя арганізацыі таксама да гэтай справы аднесьліся без дастатковай увагі. Гэтыя органы не зразумелі таго, што мы павінны даць Чырвонай арміі папаўненьне пісьменнае агульна і тэхнічна.

Барысаўскі раён не павінен заспакойвацца на дасягнутых посьпехах, а трэба і надалей і глыбей весьці работу, трэба зьнішчыць недахопы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Ніводнага няпісьменнага і малапісьменнага сярод прызыўнікоў—гэткая задача.

Бараноўскі.

Петрыкаўскі РВК і райком КП(б)Б павінны зараз наладзіць работу

Па Камаровіцкім сельсавеце Петрыкаўскага раёну па падрыхтоўцы да прызыву амаль няма ніякай сапраўднай работы.

Сярод прызыўнікоў каля 20 проц. **няпісьменных, астатнія ўсе малапісьменныя,** але сапраўднай работы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці не вядзецца.

У лік прызыўнікоў **праходзяць чужыя элементы,** накшталт, раскулачанага **Дзеюна Барыса,** але-ж сапраўднай увагі адбору клясава-чужых элемэнтаў мясцовыя арганізацыі не аддаюць.

Ніякай работы па ўкараненьні вайсковых ведаў у масу прызыўнікоў не вядзецца, вайсковых гурткоў зусім няма.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі пытаньне прызыву нават зусім і не абгаварвалі.

Петрыкаўскі РВК і Райком партыі павінны праверыць работу Камаровіцкага сельсавету і наладзіць яе пакуль ня позна як патрэбна.

Зубасты Рыгор.

Апартуністыя Пухавіцкага раёну папаўненьнем РСЧА ня цікавяцца

Прызыў па Пухавіцкім раёне пачынаецца 13 верасьня, але ня ўсе прызыўнікі ведаюць, калі і дзе будзе адбывацца паседжаньне прызыўных камісій.

Загады па вёсках не разасланы (Кузенскі, Дрычынскі, Блюнскі, Гараліцкі і др. с.-саветы).

У рады РСЧА прапазіць чужы элемент, сьпісы прызыўнікоў не абгаворваны на прызыўных с.-саветах, дзе-б павінны быць дадзены характарыстыкі кожнаму прызыўніку.

Рыг. Асака.

Менск у першых радох падрыхтоўкі да прызыву

Сёньня ў Менску пачаўся прызыў 1909 году. Вопыт падрыхтоўкі па Менску і Менскім раёне цікава разгледзіць і скарыстаць астатнім раёнам і гарадам БССР. Падрыхтоўка да прызыву па Менску ў бягучым годзе праводзілася некалькі інакш, чымся ў мінулых гадох.

Клясавы адбор

У мінулых гадох гэту работу вялі выключна адборачныя камісіі і толькі ў 1930 годзе на вёсны, (а не па гораздзе) пытаньне клясавага адбору было пастаўлена перад савецкай грамадзкасьцю. У бягучым годзе ўвесь цэнтр цяжкасьці па клясавым адборы перанесены на прадпрыемствы, калгасы, саўгасы. Акрамя афіцыйных матар'ялаў адборачная камісія скарыстоўвае данныя шырокай савецкай грамадзкасьці. Кандыдатуры ўсіх прызываемых абгаварваліся на сходах рабочых, сялян і служачых. Па буйных прадпрыемствах былі складзены адборачныя тройкі.

Трэба сказаць, што наогул работа па адборы прайшла добра. Яна была скончана да 5 верасьня на 95 проц.

Але некаторыя прадпрыемствы і ўстановы і да гэтага часу яшчэ нічога не зрабілі: **Белдзяржбуд, МЦРК...** Лепш работа прайшла па прадпрыемствах і горш на вёсцы

Справа была новая і таму нямінучы былі некаторыя памылкі і недахопы. На паасобных прадпрыемствах падыходзілі да адбору вельмі жорстка: не дапускалі ў рады арміі нават рабочых, якія не па ўдарнаму работалі на вытворчасьці, але па ўсіх астатніх умовах варты былі служыць у РСЧА. Некаторыя прадпрыемствы выказвалі неадварот—мяккацелаасьць, дапускаючы ў рады арміі асоб, зусім падаэроных, тлумачачы гэта тым, што «армія выправіць, навучыць».

Былі выпадкі, калі адборачныя тройкі не даводзілі справу да канца. Напрыклад, зусім правільна не дапускалі ў рады арміі якога небудзь з членаў камсамолу, але-ж не ставілі пытаньне аб выключэньні яго з радоў ЛКСМБ. Усе такія памылкі выпрабуліся гарадзкой адборачнай камісіяй, якая ўвесь час сачыла за работай на прадпрыемствах, часта праводзячы там свае паседжаньні.

Усяго да гэтага часу па Менску недапушчана ў рады РСЧА каля 3,5 проц. прызыўнікоў.

Ліквідацыя няпісьменнасьці

Яшчэ з пачатку году сьпісы няпісьменных і малапісьменных прызыўнікоў былі перададны органам Наркамасьветы. У маі месяцы загадчыкі ліквпунктаў дакладвалі, што ліквідацыя няпісьменнасьці ідзе добра. Заг. ліквпункту тав. **Барсукоў,** напрыклад, дакладваў, што ў яго з ліку 32-х прызыўнікоў, якія павінны займацца, займаюцца—28. Праверка зробленая Ваенкаматам, даявяла, што ліквідацыя няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў ідзе зусім дрэнна. У таго-ж **Барсукова** займаліся не 28 прызыўнікаў, а толькі 3—4 прызыўніка...

Калі гэта высьветлілася прыйшлося шукаць іншых шляхоў. У ліпені месяцы было арганізавана 5 школ, да якіх прымацавана каля 130 прызыўнікоў, былі арганізаваны ліквпункты непасрэдна на прадпрыемствах. Усім няпісьменным і малапісьменным прызыўнікам былі выданы кантрольныя лісты, у якіх адзначалася аб наведваньні ліквпунктаў. Гэтыя лісты прызыўнікі павінны падаваць прызыўной камісіі. Ход работы правяраўся шляхам выклікі паасобных няпісьменных прызыўнікоў у Ваенкамат. Спачатку наведваемасьць школ была добрая, але потым яна зьнізілася да 50 проц. Гэта тлумачыцца тым, што выявілася частка ўпарта нежадаючых ліквідаваць сваю няпісьменнасьць, а таксама і тым, што некаторыя прадпрыемствы (завод імя Варашылава, «Камунар», будаўнікі...) не жадалі перавесьці няпісьменных прызыўнікоў на зьмены, з тым, каб яны маглі займацца бесьперапынна. Адбіваліся на занятках і водпускі, хвароба і інш. прычыны. Трэба лічыць, што каля 15 проц. няпісьменных ліквідавалі сваю няпісьменасьць дрэнна з прычыны ўпартага нежаданьня займацца.

Нельга не адзначыць работу 1-й школы і настаўніка тав. **Лорман,** які аддаў шмат сілы і энэргіі на гэту справу, змог зацікавіць прызыўнікоў, выклікаць у іх уздым, энтузіязм і правадзіў работу сапраўды па ўдарнаму. **Яго работа адзначана падзякай Ваенкаматам. У гэтай школе 4 прызыўніка прэміраваны за ўдарную работу** па ліквідацыі сваёй няпісьменнасьці і ўцягваньні ў работу іншых.

Масавая работа

Спачатку масавая работа сярод прызыўнікоў ішла зусім марудна. 50-60 проц. усіх сходаў, якія склікаліся на прадпрыемствах і ва ўстановах зрываліся. Першы гарадзкі сход таксама быў сарваны. Але-ж потым справа пачала наладжвацца. Другі гарадзкі сход прайшоў здавальняюча, на яго зьявілася больш тысячы прызыўнікоў. На зьлёце ў садзе «Прафінтэрн» 10-га ліпеня было ўжо каля 10.000 прызыўнікоў і моладзі нараджэньня 1910 і 1911 гадоў.

Прызыўнікі зьяўляліся ў арганізаваным парадку калёнамі, з аркестрам, лёзунгамі і г. д. Сходы і зьлёт праходзілі вельмі актыўна. Гэта тлумачыцца разгортваньнем масавай работы на прадпрыемствах.

На 60 проц. масавая работа праводзілася камсамолам. Калі ў мінулым годзе Менская арганізацыя ЛКСМ амаль нічога не зрабіла па прызыву, дык у бягучым годзе **яна разгарнула вялікую работу.** Гарком ЛКСМБ пытаньне прызыву разглядаў 9 разоў і ня толькі даваў дырэктывы ячэйкам, але і правяраў іх выкананьне. Да недахопаў работы Менскага Гаркому камсамолу трэба аднесьці тое, што ён недастаткова рэзка біў па тых камсамольскіх ячэйках, якія дрэнна выконвалі яго дырэктывы па прызыўной рабоце.

Калі арганізацыя камсамолу добра працавала, дык **астатнія арганізацыі амаль нічога не рабілі. ЦСПСБ і гарпрафсавет абмежаваліся толькі папяровымі распараджэньнямі,** але зусім не правяралі іх выкананьня. Прафарганізацыі на прадпрыемствах недаацанілі работы прызыву, не зразумелі, што справа папаўненьня Чырвонай арміі—гэта справа ўсёй рабочай грамадзкасьці. Яны праводзілі падрыхтоўку да прызыву без жаданьня, марудзілі з гэтай справай.

Зусім нічога не зрабіла вайсковая сэкцыя Менскага гарсавету. Старшыня сэкцыі толькі ўчора сабраўся паставіць на бюро сэкцыі пытаньне аб прызыве і даклад ваенкому.

Гарсавет Асаавіяхіму дапамог арганізаваць гарадзкія сходы прызыўнікоў і гэтым абмежаваўся. **Ніякай масавай работы на прадпрыемствах асаавіяхімаўскія арганізацыі не разгарнулі,** не дапамагалі рабоце Ваенкамату.

Тое-ж самае наглядаецца і па ўсіх іншых грамадзкіх арганізацыях: **Аўтадор, МОПР, «Прэч Няпісьменнасьць» не пажадалі прыняць удзел ў падрыхтоўцы да прызыву.**

Гэта адсутнасьць удзелу ў прызыўнай рабоце прафсаюзнальных і грамадзкіх арганізацый зьяўляецца прычынай асноўнага недахопу ў падрыхтоўцы да прызыву: каб не сарваць работы Ваенкамат прымушаны быў падмяняць сабой паказаныя арганізацыі. Работнікі Ваенкамату амаль штодзённа выяжджалі на прадпрыемствы, праводзілі гутаркі, даклады, правяралі работу. **Ваенкаматам было арганізавана 88 брыгад, у якіх удзельнічала да 150 прызыўнікоў.** Толькі на заводзе «Ударнік» асаавіяхімаўская арганізацыя добра праводзіла работу.

Зусім нічога не зрабілі па падрыхтоўцы вайсковыя часьці, якія шэфствуюць над прадпрыемствамі.

Папярэднія вывады работы па падрыхтоўцы да прызыву ў Менску паказваюць, што падрыхтоўчая работа была разгорнута даволі добра, але-ж буйнейшым недахопам зьяўляецца недастатковы ўдзел у рабоце прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый, якія выклікалі падмену гэтых арганізацый Ваенкаматам.

Вельмі слаба ўдзельнічала ў прызыўнай рабоце прэса, як цэнтральная, таксама і шматтыражкі і насьценгазэты.

М. Тараруй.

Абеды напалову з мухамі

Грамадзкае харчаваньне рабочых саўгасу **Дукоры, Пухавіцкага раёну,** пастаўлена зусім дрэнна. Рабочым часта не хапае абедаў. Абеды напалову з мухамі, бо ў сталоўцы няма мінімальных гігіенічных умоў. На час асенняй сяўбы грамадзкае харчаваньне ні на горш не палепшылася. Дырэктар саўгасу тав. **Спаліс** гэтай справай ня цікавіцца; ён не адпускае прадуктаў харчаваньня для рабочых. На гаспадарчы разрахунак сталоўка яшчэ да гэтага часу не пераведзена.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб палепшэньні грамадзкага харчаваньня яўна ігнаруецца апартуністамі.

Цімох Лявіцкі.

Ельскі райкалгассаюз зрывае вярбоўку

У Ельскім раёне вярбоўка рабочай сілы для Данбасу праходзіць вельмі марудна. На сёньняшні дзень у раёне ня ўзьнята грамадзкая думка вакол гэтага важнага палітычна-гаспадарчага пытаньня. З боку некаторых грамадзкіх арганізацый наглядаецца недаацэнка і абураючыя адносіны да вярбоўкі рабсілы. Прафарганізацыі ў гэтай галіне бязьдзейнічаюць. Райкалгассаюз хоць і даў разьмеркаваньні аб вылучэньні рабсілы па калгасах, але не паказаў тэрміну для вылучэньня і зараз 76 калгасаў раёну ня ведаюць калі патрэбна выслаць рабсілу. Вярбоўшчыкі абураны гэткім «садзейнічаньнем» у правядзеньні вярбоўкі з боку райкалгассаюзу.

Камсамольская арганізацыя Ельскага раёну таксама не пераварыла ў жыцьцё сваю пастанову аб тым, каб з кожнай ячэйкі вылучыць па адным лепшым таварышу. Таксама маюцца абураючыя адносіны да гэтай справы з боку некаторых калгасаў. Напрыклад, старшыня калгасу **«Чырвоны Ельск» тав. Карасік** так адказаў вярбоўшчыкам—**«Не дамо! Нам і самім патрэбна рабсіла».**

Такія адносіны да вярбоўкі рабочых на Данбас зрываюць пасыляховае правядзеньне гэтай работы.

Трэба зараз-жа ўзьняць усю грамадзкасьць з тым, каб 125 лепшых работнікаў былі пасланы на Данбас—вучастак новых сацыялістычных заваёў.

Н. Я. Невядомскі.

За брыгадны мэтад працы на лесазагатоўках

Адсутнасьць кіраўніцтва, струмэнтаў, прадуктаў харчаваньня пагражае зрывам лесазагатоўкам і лесавывазкам у Клічаўскім і Бацэвіцкім вучлеспрамгасах. Сьмілавіцкі райвыканком перашкаджае вярбоўцы рабочай сілы на лесазагатоўкі і лесасплаў

Да адказнасьці зрываючых лесазагатоўкі і лесавывазкі

Неадкладна ліквідаваць прарывы

(Клічаўскі раён, Бабруйскі леспрамгас)

Месячнік па ліквідацыі прарываў у лесазагатоўках і лесавывазках Бацэвіцкі і Клічаўскі вучлеспрамгасы, застаў у поўнай непадрыхтаванасьці. Паказаныя вучлеспрамгасы амаль увесь час ня вылазяць з прарываў. Бацэвіцкі вучлеспрамгас усяго на 9 проц. выканаў плян дровазагатовак, Клічаўскі—6 проц.

Кіраўнікі гэтых леспрамгасаў у сувязі з правядзімым месячнікам дровазагатовак не узмацнілі работы па загатоўцы дроў і процант загатовак дроў і лесу ўверх ня ўзьняўся.

Клічаўскі і Бацэвіцкі вучлеспрамгасы атрымалі тэлеграмы аб тым, каб прыняць рабочыя дружыны для непасрэднай работы ў лесе. Калі рабочыя дружыны, у ліку 500 чал. прышлі ў лес працаваць, тады толькі ляспы апарат пачаў клапаціцца аб забесьпячэньні іх сякерамі, піламі, харчаваньнем. Такім чынам рабочыя, ня маючыя інструмантаў, блукалі па лесе бяз працы. Тэхкіраўнікі бегалі па хатах пазычаць сякеры, пілы і інш. У крамах ня было прадуктаў харчаваньня. Рабочым выдалі масла і рыбу і больш нічога. Мукі і хлеба таксама ня было. З такім «забесьпячэньнем» дружыны не маглі працаваць. На чацьвёрты-пяты дзень з Бабруйску даставілі каўбасу і кансэрвы, якіх хапіла толькі на 5 дзён. Каўбаса ўвесь час зьяўлялася асноўным мясным прадуктам, і праз некалькі дзён ад таго, што захоўвалася неправільна сапсавалася.

Падрыхтоўка палаточаў і вальшчыкаў рабілася пасьля прыезду рабочых. Такім чынам дружыны прастайвалі з-за тупых піл.

Расстаноўка рабочай сілы адразу была ўтворана няправільна. Брыгады складаліся на 6-7 чал., і шмат якія з іх непрадукцыйна страчвалі рабочы час. Дзякуючы галавацяпству Левіна (Лесбел, Менск) у Бацэвіцкі вучлеспрамгас накіравалі амаль усе дружыны, а ў Клічаўскі зусім нічога. Клічаўцы добра падрыхтаваліся, атрымалі паведамленьне, а людзей ня было.

Абураючыя факты безадказных адносін да кіраваньня работай у лесе выяўляюцца ў тым, што лесатэхнікі, і дзесятнікі, замест таго, каб пайсьці ў лес кіраваць працай,—бяруць спрэль бы і ідуць на паляваньне, а рабочыя ў лесе застаюцца адны і нічога ня робяць.

Гатовы лес гіне, а галавацяпы валяць новы

Па Клічаўскім і Бацэвіцкім вучлеспрамгасах у лесе шмат ёсьць дрэў мінулагодняй валкі. Гэты лес (бяроза) чамусьці на дровы не перапрацоўваецца і для рэзкі дроў адводзяцца новыя дзялянкі. Калі-ж пад націскам брыгад па Бацэвіцкім вучастку ўзмацніўся вываз дроў, дык жадаючых рэзаць і вазіць дровы накіроўвалі валіць лес з пня, а сухія дровы пакідалі ляжць у лесе.

Сыгналы друку аб буйных прарывах на дрова-і-лесазагатоўках да Клічаўшчыны не дайшлі. Калі ў першы час РК КП(б)Б і РВК і былі прыняты рашэньні аб ліквідацыі прарыву, дык яны засталіся на паперы. Для кіраванняя справаю была абрана ўдарная пяцёрка, якая палец аб палец ня ўдарыла.

Сельсаветы на мясцох вакол загатовак дроў і лесазагатовак не ствараюць грамадзкай думкі, не мабілізуюць сялян на ліквідацыю прарываў. Уладзімерскі, Несяцкі, Бацэвіцкі і Клічаўскі сельсаветы гэтай справай зусім ня цікавяцца, члены сельсавету замест работы, п'яньствуюць і дэмаралізуюць сялянства (Уладзімерскі, Несяцкі сельсаветы).

Браць прыклад з ударнікаў

Віркаўскі сельсавет дзе працуюць ударныя брыгады з Менску, работу па загатоўцы дроў наладзіў. Тут мабілізаваны ўвесь актыў. Вызначаны адказныя асобы за дровазагатоўкі па вёсках, даны заданьні, правяраюцца выезды, асабліва цьвёрдазаданьнікаў. Добра работае насьценная газэта «Калектыўны Шлях». Газэта бічуе лодыраў, паказвае лепшых. Газэта разгарнула сацсаборніцтва паміж пунктамі, вучасткамі. Праз кожныя 3 дні даецца зводка аб выкананьні пляну. Лепшыя прэмёруюцца, партячэйка добра кіруе работай па справах лесазагатовак, усе партыйцы прымацаваны да пунктаў. Ужо ўвесь лес, загатоўлены раней (да 3000 куб. мэтр.) вывезены. Зараз распачата рубка і возка. Па Віркаўскім сельсавеце трэба раўняцца ўсяму Клічаўскаму раёну.

Ударная брыгада рабочых Менскіх фабрык і заводаў: **Шэмпель, Патоцкі, Перальман.**

Дрэнная вывазка лесу пагражае зрывам асеньняга лесасплаву

Работа Бабруйскай сплаўнай канторы па сплаве ў сучасны момант упіраецца ў разгортваньне вывазкі лесаматар'ялаў да прыстаняў. Зараз ідзе шпаркая работа па вязцы лесаматар'ялаў.

Бабруйская сплаўная кантора павінна сплавіць за сэзон больш 2 мільёнаў кубамэтраў лесаматар'ялаў. Фактычна-ж вывезена іх толькі 920 тыс. кубамэтраў.

Трэба адзначыць, што па паасобных раёнах наядбайна адносяцца да сплаву, не садзейнічаюць працаўнікам сплаву ў іх рабоце. Па Бятомльскім раёне мелі месца такія факты, што старшыня райвыканкому **Русак** выганяў з кваёго габінэту працаўнікоў сплаву, якія прасілі **паставіць іх даклад на** прэзыдыуме РВК. Плешчаніцкі РВК не аказаў ніякай дапамогі ў вярбоўцы калгаснікаў на сплаў. Лагойскі райвыканком ня прыняў мер да пабудовы зьнесеных грэбляў. Сьмілавіцкі райвыканком нават не дазволіў праводзіць па раёне вярбоўку сплаўшчыкаў.

Гэтая апартуністычная няўважлівасьць значна перашкаджае рабоце па сплаве. Гэтай рабоце таксама перашкаджае і абсалютная бязьдзейнасьць райвыканкомаў і сельсаветаў у вывазцы лесу.

Месячнік вывазкі лесу, які пачаўся па некаторых раёнах з 5-га чэрвеня, ня даў належнага зруху ў вывазцы лесаматар'ялаў. Леспрамгасы і райвыканкомы не мабілізавалі ўвагі грамадзкасьці на гэтым пытаньні. Вывазкі лесу пакуль-што няма. Гэта пагражае зрывам пляну сплаву. Гэтага зрыву ні ў якім разе нельга дапусьціць.

Д. Аланскі.

Механізаваць пагрузку і выгрузку лесу і дроў

На лесасплаве БССР, пагрузка барж вытвараецца на плячох рабочых і пад воскай на конях, што выклікае выдаткі і прастоі барж.

Працаўнік Лесбелу тав. **Пякурын** унёс прапанову мэханізаваным спосабам вытвараць пагрузку пры дапамозе пляцовак. Пляцоўка мае выгляд ваганэткі на чатырох чыгунных колцах, а рамы драўняныя, змацаваныя жалезнымі рагавжамі і баўтамі, разьмерам: шырыня 0,85 см., вышыня 1,25 см. і даўжыня 2 мэтры. Пляцоўка зьмяшчае на сабе 2 з палов. куб. мэт. дроў.

Гэта ваганэтка пляцоўка ходзіць па шарнірнай дарожцы, якая зроблена са зьвеньняў. Замест шпал зроблены драўняныя брускі 35 мм х 8 см. змацаваныя паміж сабою жалезнымі баўтамі. Гэтыя зьвеньні складаюцца адно да другога і атрымліваецца вылітай чыгункі, па якой і ходзіць пляцоўка. Кожнае зьвяно лёгка паддаецца пераносцы двума рабочымі, калі яе патрэб на перанесьці, або прадоўжыць да другога штабелю дроў.

15-га жніўня г. г. на прыстані Астоўках Гомсплаўканторы была вытварана проба работы на гэтых пляцоўках. Вынікі пажаданыя. Адна баржа пры наяўнасьці 2-х пляцовак і 7 рабочых была нагружана (баржа 77 куб. мэт.) за 4 гадзіны, у той час калі гэтыя-ж рабочыя працуючы звычайна за 4 гадзіны пагрузілі толькі 28 куб. мэт. Такім чынам памяншаецца час пагрузкі, пагрузка каштуе больш як напалову таней, прадукцыйнасьць працы падвышаецца на 100 проц. Сама пляцоўка можа работаць на працягу 2-х навігацый, чым можна з'эканоміць час, грошы і палову рабсілы. Напрыклад: у гэту навігацыю па нашай сплаўканторы патрэбна было перавезьці дроў 320.00 куб. мэт. лічучы па 60 кап. за кубамэтр пры звычайнай пагрузцы патрэбна заплаціць рабочым 192.000 руб., а пры скарыстаньні пляцовак патрэбна заплаціць толькі (па 30 кап.) 96.000 руб.

Каштоўнасьць патрэбных пляцовак на 20 прыстанях з разьлікам на 2 гады абходзіцца толькі 103.500 руб. Такім чынам мы маем эканоміі 88.500 р. грошай, напалову менш будуць стаяць баржы, павялічваецца грузазварот і патрабуецца напалову менш рабсілы.

Гэта мерапрыемства дае просты вопыт мэханізацыі пагрузкі барж па вынаходзтву тав. **Пякурына.** Гэты вопыт патрэбна шырока распаўсюдзіць па ўсёй БССР, што дасьць мільёны руб эканоміі для нашай краіны. Трэба каб Леспрамгасы і Сплаўканторы не забыліся на гэткае каштоўнае і простае вынаходзтва.

Ф. Каган і Даманаў Алесь.

Данбасу—рабочую сілу

Плян вярбоўкі павінен быць выкананы

Рашуча ўдарыць па зрыўшчыках вярбоўкі

Зараз-жа разгарнуць вярбоўку

(На паседжаньні Цэнтральнай камісіі садзейнічаньня)

Учора ў Наркамправы БССР адбылася паседжаньне цэнтральнай камісіі садзейнічаньня вярбоўцы рабочай сілы для Данбасу.

На паседжаньні быў заслухан даклад аб ходзе вярбоўкі, з якога відаць, што вярбоўка рабочай сілы для Данбасу ў БССР праходзіць чарапашымі тэмпамі. Прычына гэтага ў тым, што на мясцох раёныя арганізацыі не даацэньваць палітычна - гаспадарчага значэньня гэтай справы і да яе адносяцца фармальна, па бюракратычнаму. На мясцох вакол справы забесьпячэньня Данбасу рабочай сілай ня створана грамадзкай думкі і да правядзеньня гэтай работы не прыцягнута грамадзкасьць.

Ёсьць рад фактаў калі нават райінспэктары працы гэтым пытаньнем не займаюцца. **(Крупскі, Талочынскі** і інш.) раёны

Калгасы таксама тармозяць работу па вярбоўцы не адпускаючы калгаснікаў, якія жадаюць ехаць на Данбас. У Ельскім раёне РВК даў калгасам распараджэньне аб тым, каб на Данбас калгасы давалі ня больш 3-х чалавек і ня менш 1. Гэты факт гаворыць аб фармальна-бюракратычных адносінах да вярбоўкі рабочай сілы на Данбас.

Трэба таксама адзначыць, што ў работе вярбоўшчыкаў на мясцох ёсьць некаторая няўвязка. У радзе месц вярбоўшчыкі прыяжджаюць у раёны і замест таго каб адразу зьвязацца з раённымі арганізацыямі ад'яжджаюць у калгасы і там, адарвана ад грамадзкіх арганізацый праводзяць работу па вярбоўцы. Зусім зразумела, што пры такіх умовах работа ня мае посьпеху. Нарада адзначыла, што і з боку ЦСПСБ да гэтага пытаньня праяўлена вельмі нязначная ўвага. ЦСПСБ павінен быў мабілізаваць у раёны 10 вярбоўшчыкаў, але ён гэтага не зрабіў і абмежаваўся тым, што даў «дырэктывы» аб уключэньні ў гэтую кампанію райпрафсаветаў. Райпрафсаветы на мясцох па гэтым пытаньні не праводзяць ніякай работы.

Камсамол Беларусі, у вярбоўцы прымае зусім малы ўдзел. ЦК ЛКСМБ павінен быў паслаць у раёны 15 вярбоўшчыкаў. На сёньня пасланa толькі 4, якія на мясцох амаль нічога ня робяць.

Камісія адзначыла, што перадавымі па вярбоўцы рабочай сілы ў Данбас ідуць Жлібонскі, Чэрыкаўскі, Кармянскі, Сенненскі і Касьцюковіцкі раёны, а астатнія яшчэ ганебна цягнуцца ў хвасьце. Камісія адзначыла, што зусім мала аддае ўвагі гэтаму пытаньню цэнтральны і раённы друк.

Апроч гэтага камісія прыняла рад канкрэтных мерапрыемстваў па хутчэйшым разгортваньні вярбоўкі.

Басько.

Адзінаццаць раёнаў яшчэ ня далі ніводнага рабочага

ЗВОДКА

аб ходзе набору рабочай сілы дзя аб'яднаньня „Вугаль" па раёнах БССР

за час з 21-VIII—па 6-IX 1931 г.

Назва раёну	Кантрольная лічба па раёну	Выканана на 1-IX		Накіравана на работу з 1-IX па 6-IX		Усяго на 6-IX	
		Усяго	З іх калгасьн.	Усяго	З іх калгасьн.	Усяго	З іх калгасьн.
Бешанковіцкі	200	10	9	5	—	15	9
Бялыніцкі	150	—	—	20	—	20	—
Барэзінскі	125	8	3	14	4	22	7
Горацкі	150	—	—	—	—	—	—
Жлобінскі	100	—	—	—	—	—	—
Камарынскі	250	—	—	—	—	—	—
Ельскі	125	—	—	17	5	17	5
Кармянскі	100	47	20	—	—	47	20
Касьцюковіцкі	350	56	2	21	21	77	23
Клімавіцкі	400	—	—	—	—	—	—
Клічаўскі	200	12	9	15	—	27	9
Крупскі	100	—	—	—	—	—	—
Крычаўскі	200	3	3	—	—	3	3
Лепельскі	150	—	—	4	3	4	3
Лёзьнянскі	100	—	—	—	—	—	—
Чаўскі	150	—	—	5	1	5	1
Лоеўскі	125	8	1	9	—	17	1
Мсьціслаўскі	200	—	—	—	—	—	—
Нараўлянскі	250	—	—	—	—	—	—
Петрыкаўскі	150	13	9	—	—	13	9
Рагачоўскі	200	—	—	21	3	21	3
Рэчыцкі	200	7	3	2	2	9	5
Сенненскі	150	—	—	—	—	—	—
Чэрыкаўскі	125	—	—	11	11	11	11
Сіроцінскі	150	—	—	—	—	—	—
Уваравіцкі	125	—	—	28	2	28	2
Чашніцкі	200	—	—	11	3	11	3
Шклоўскі	150	2	2	—	—	2	2
Гарадоцкі	125	—	—	—	—	—	—
Дубровенскі	—	10	—	—	—	10	—
Брагінскі	—	19	16	—	—	19	16
Магілеўскі	—	26	24	—	—	26	24
Слуцкі	—	39	9	4	4	43	13
Усяго	5000	260	110	187	59	447	169

Увага: Апошнія 4 раёны: Дубровенскі, Брагінскі, Магілеўскі і Слуцкі ў разь вёрстку Наркамправы і Белкалгасцэнтру не ўваходзяць.

Зводка выканан

За бесьперабойнае фінансаваньне сацыялістычнага будаўніцтва

Выкананьню фінпляну 3-га рашаючага—бальшавіцкія тэмпы

Прыцягненьнем шырокіх мас да справы мабілізацыі сродкаў ударым па апартунізму і палітычнай блізарукасьці

Вопыт Гомелю—ва ўсе зьвеньні фінапарату БССР

За бесьперабойнае фінансаваньне сацыялістычнага будаўніцтва

Да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў фінпляну

Правы апартунізм, „левыя" загібы прывялі Чырвонапольскі раён да ганебнага прарыву

На гледзячы на тое, што тэрмін скончэньня падліку аб'ектаў абкладаньня ўжо даўно скончыўся, асобныя раёны гэтай работы яшчэ не правялі.

Чырвонапольскі раён да гэтага часу ня скончыў улік аб'ектаў па калгасах, выяўленьня кулацка-заможных гаспадарак раёну. Мы маем у асобных сельсаветах Чырвонапольскага раёну недавыяўленьне кулацка - заможных гаспадарак, а ў іншых сельскіх саветах пераабкладаньне серадняку. Калі ўзяць **Гораўскі сельсавет**, у якім у мінулым годзе налічвалася 5 кулацкіх гаспадарак, дык у гэтым годзе ня выяўлена ніводнай. У **Новаельнянскім** было 8—у гэтым годзе таксама «не аказалася» ніводнай кулацка-заможнай гаспадаркі. Тое-ж самае атрымалася і у **Мхініцкім** сельсавеце.

Але побач з гэтым мы маем такое зьявішча, што ў **Кажаменскім, Клясенскім** і іншых сельсаветах індывідуальным абкладаньнем закранута серадняцкая частка вёскі. Наогул на работу па абкладаньні ў індывідуальным парадку, з боку сельскіх саветаў і райфа ня было зьвернута належнай ўвагі. Гаспадаркі, падлягаючыя абкладаньню ня былі добра вывучаны, у выніку чаго ў адных сельсаветах аблажылі серадняка ,а ў другіх не крануті кулака.

Плян па сельгаспадатку ў Чырвона польшчыне ня быў належным чынам прапрацаваны і зараз маецца такое зьявішча, калі ў асобных сельсаветах як напрыклад **Гораўскім** 60 проц. гаспадарак, вызваленых ад падаткаў, а ў радзе іншых сельсаветаў вызвалены па 9, 13, 27, гаспадарак. Гэта сьведчыць аб тым, што работнікі раёну не зьвярнулі належнай ўвагі на правядзеньне гэтай работы, недаацанілі палітычнага значэньня справы абкладаньня сельгаспадаткам у выніку чаго іх палітычная нізкавокасьць прывяла да грубейшых палітычных памылак ў падатковай рабоце.

Спагнаньне сельгаспадатку прахоліць таксама вельмі дрэнна. За 3-ці квартал павінна паступіць 77.100 руб., а пакуль што спагнане ўсяго 26.800 р., што складае 34 проц. плану. Кулакі да гэтага часу яшчэ ня ўнесьлі падатку, а раённыя арганізацыі нічога не зрабілі каб прымусіць кулака выканаць вызначаны яму падатак. З кулацкіх гаспадарак замест 39.029 руб. 40 кап. спагнана толькі 375 р. прашыма і 22.600 руб. маёмасьцю.

Ня лепш абстаіць справа з мабілізацыяй іншых відаў сродкаў, выкананьне якіх складае толькі 27,1 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, як чырвонапольскія работнікі «мабілізуюць» сродкі.

Ашчадкаса ня мае яскравых лічбаў выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў. Бухгальтар ашчадкасы **Асмадоўскі п'янствуе** замест таго, каб займацца справай і ніхто яго ня думае прыцягнуць да адказнасьці.

Сваёй нізоўкай ашчадкаса зусім ня кіруе

Плян рэалізацыі пазыкі па аднаасобным сэктары выкананы толькі на 20 проц.: замест 131.000 руб. пазыка рэалізавана на 25.000 руб.).

Раённы камітэт партыі ня ўзьдзейнічаў належным чынам на тых, хто нежадае выконваць дырэктывы партыі і ўраду аб мабілізацыі сродкаў. Недаабкладаньне ў паасобных сельсаветах кулацка-заможных гаспадарак і пераабкладаньне серадняка ў другіх, адсутнасьць яскравасьці ў гэтым пытаньні інакш як скрыўленьнем клясавай лініі і апартунстычнай практыкай назваць нельга. Райвыканком замест таго каб мабілізаваць актыў і ўсю грамадзкасьць раёну на ліквідацыю прарыву, пусьціў гэту справу па хвалях апартунстычнага самацёку. РВК не праверыў як выконваецца пастанова яго пленуму па пытаньні ходу мабілізацыі сродкаў.

Мы патрабуем распусьціць тыя камісіі садзейнічаньня, у тым ліку і раённыя, якія бязьдзейнічалі, бухгальтара **Асмалоўскага** зьняць з работы і за зрыў яе—аддаць пад суд

Раённы камітэт партыі і райвыканком павінны неадкладна мабілізаваць партыйную арганізацыю і ўсю савецкую грамадзкасьць, на ліквідацыю прарыву з тым, каб у верасьні месяцы выправіць усе дапушчаныя на мясцох памылкі і выканаць поўнасьцю фінплян.

Касьціневіч.

„Трохдзёньнікі барацьбы за фінплян"—у практыку ўсіх раёнаў БССР

За апошнюю дэкаду нарастаньне тэмпаў мабілізацыі сродкаў зусім недастатковае: на 20-VIII плян быў выкананы на 33,9 проц. Па радзе паказьнікаў ёсьць ганебныя прарывы; па фізычных укладах плян выкананы на 19,5 проц., па абавязацельствах, «Сельгаспадабкэньня»—19,6 проц., па акцыі Трактарацэнтру—39,3 проц., па пазычках-пазыкі—48,5 проц., (па горадзе і ў вёсцы) 46,4 проц., зварот с.-г. пазык 40,6 проц.

Гэтыя паказьнікі, сьведчаць аб тым што фінбанкаўскі апарат яшчэ не перабудаваў сваёй работы, ня ўзяў упору на масавую работу, на арганізацыю грамадзкасьці ў выкананьні фінпляну.

Па 25 раёнах фінплян выкананы ад 23 да 44 проц. Толькі асобныя раёны па ўдарнаму ўзяліся за гэту справу.

Гомель на прарыў адказаў новымі мэтадамі работы. Узварушыў грамадзкасьць і дасягнуў такіх вынікаў, што там запраўды спаборнічаюць масы ў барацьбе за выкананьне фінпляну, дзякуючы чаму Гомель і заняў першае месца ў выкананьні пляну, даўшы ў сярэднім па раёне 62,6 проц.

Менск застаецца на другім месцы (58,3). Афармленьне пазыкі ўсё яшчэ ня окончана. Установы працасьветы не аформілі пазыкі на 123.000 руб. Сам банк выдаўшы пэнсію поўнасьцю не ўтварыў пералічэньня. **Завод імя Варашылава** не перавёў 700 руб. адлічэньняў па пазыцы, а ашчадкаса заводу аб гэтым не сыгналізавала. Ашчадны апарат супакоіўся на 100 проц. выкананьні кантрольнай лічбы і зусім запамятаў пра дырэктыву аб 100-процантным ахопе падпіскай ўсіх працоўных. Па аднаасобным сэктары заданьне па рэалізацыі пазыкі выкананa ўсяго на 23 проц.

Мэтады работы Гомелю яшчэ не падхоплены ніводнай арганізацыяй. Работа вядзецца выключна апаратным парадкам.

Для ліквідацыі прарыву і мабілізацыі мас на гэту справу **ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў** арганізуе «3-х дзёньнікі масавага паходу за выкананьне і перавыкананьне фінпляну 3-га кварталу», што павінна даць нарастаньне тэмпаў у мабілізацыі сродкаў.

Гэта мерапрыемства будзе праводзіцца з 7 па 10, з 17 па 20 і з 27 верасьня па 1 кастрычніка.

У кожны дзень гэтага трохдзёньніка павінна быць паслана ня менш 150 брыгадэіраў з такім разьлікам, каб правесьці сущэльны ахоп падпіскай працаўнікоў усіх устаноў і прадпрыемстваў гораду, завяршыць афармленьне ня толькі ў парадку рэвізорскага нагляду, але арганізаваць дапамогу ў правядзеньні поўнага ахопу падпіскай яшчэ не ахопленых, разгарнуць работу сярод сэзоннікаў, ЖАКТ-аў, саматужнікаў-адзіночак.

Адначасова гэтай работай павінны быць ахоплены ўсе сельсаветы. Для гэтай мэты РПС мабілізавана 36 асоб, з тым, каб дабіцца ня толькі пералому, а поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну.

Шэфствуючыя над НКФ, Дзяржбанкам, Гарфа прадпрыемствы не дапамагаюць гэтым арганізацыям у эматаньні за выкананьне фінпляну. Зварот рабочых Гомельскага заводу імя Ланцугова зьмешчаны ў «Савецкай Беларусі» за 31 жніўня і ўзорныя мэтады работы Гомельшчыны імі не падхоплены.

Вывучыўшы мэтады работы Гомелю, узброіўшыся імі, правёўшы па баявому трохдзёньнікі, мы павінны дабіцца выкананьня пляну трэцяга кварталу да 25 верасьня, з тым каб уступіць у чацьвёрты квартал перавыкананым плян. Пад кіраўніцтвам РК КП(б)Б, пры дапамозе Гарпрафсавету, друку і ўсёй грамадзкасьці гэта будзе выкананa.

Неабходна разьбіць горад на вучасткі, ускласьці адказнасьць за работу на паасобныя фінбанкаўскія ўстановы, ліквідаваўшы гэтым абязьлічку і самацёк у рабоце фінбанкаўскага апарату.

Па прыкладзе Менску павінны пайсьці ўсе адстаючыя раёны, на эматаньні за пераходны сьцяг Наркамфіну СССР.

Пархоменка.

Пра грамадзкія суды пры жыльлёва-каапэрацыйных таварыствах

5-га ліпеня т. г. быў апублікаваны вельмі важны заканадаўчы акт аб арганізацыі на ўсіх фабрыках, заводах і ўстановах з лікам работнікаў ня менш 50 чалавек, а таксама і пры вышэйшых школах вытворча-таварыскіх судоў. Мэтай вытворча-таварыскіх судоў зьяўляецца прыцягненьне рабочай грамадзкасьці да барацьбы з недастаткова сьвядомымі адносінамі адсталых груп рабочых і служачых да новых сацыялістычных форм працы, барацьбы з праявамі перажыткаў старога быту.

Да выданьня новага закону вытворча-таварыскія суды, былі арганізаваны ня толькі на прадпрыемствах і ва ўстаномах, але і пры жыльлёва-арэндных таварыствах.

Цяпер гэтыя суды, якія разглядалі дробныя справы бытавога характару ліквідаваны.

Трэба адзначыць, што арганізуемыя зараз вытворча-таварыскія суды ня могуць ахапіць усіх канфліктаў бытавога характару паміж працоўнымі асабліва працуючых у дробных прадпрыемствах і ўстановах. Такім чынам частка спраў бытавога характару павінна здыйсьці да падсуднасьці народнага суда. Такое становішча выклікае непатрэбную затрузку нарсудоў дробнымі справамі, чаго можна ўнікнуць, арганізаваўшы пры жактах вытворча-таварыскія суды.

Выходзячы з гэтага, Народны камісарыят юстыцыі зараз распрацаваў праект палажэньня пра грамадзкія суды пры жыльлёва-арэндных і жыльлёва-будаўнічых каапэрацыйных таварыствах.

Праз увядзеньне праектуемых грамадзкіх судоў пры таварыствах жыльлёвай каапэрацыі значная частка спраў пэўных катэгорый будзе вырашацца грамадзкім таварыскім спосабам.

Праект НКЮ адносіць да падсуднасьці грамадзкіх судоў пры жактах справы аб абразах, паклёпах, пабоях і хуліганствах, справы аб крадзяжы, або наўмысным псаваньні чужой маёмасьці на суму ня больш 50 руб., калі гэтыя дзеяньні ня носяць крымінальнага характару. Гэтым-жа судом надаецца права вырашаць дробныя (да 50 руб.) грамадзкія спрэчкі апроч іскаў, якія грунтуюцца на фармальных дакумантах (вэксалёх, натарыяльна-пасьведчаных зьдзелках і т. д.) іскаў, якія вынікаюць з аўтарскага права, іскаў за пакалечаньне, а таксама алімэнтаў і працоўных спраў.

Словам, грамадзкі суд будзе разглядаць толькі нескладаныя грамадзкія справы.

Апроч пералічаных вышэй катэгорый спраў, якія носяць бытавы характар, грамадзкія суды пры жактах паводле праекту НКЮ павінны разглядаць яшчэ справы: аб безгаспадарчых адносінах да жыльля, справа па спрэчках паміж жыхарамі аб парадку карыстаньня жылымі і няжылымі памяшканьнямі, дварамі і садамі, аб праве праходу праз чужы пакой, спрэчка аб унутраным парадку ў кватэрах, справы па спрэчках аб вызначэньні плошчы кватэр, аб разьмеркаваньні паміж жыхарамі платы за сьвятло, цэнтральны апал і т. д., справы аб антысанітарным утрыманьні кватэр.

Апроч пералічаных катэгорый спраў да кампэтэнцыі грамадзкага суда пры жыльлёва-каапэрацыйным таварыстве аднесены яшчэ разгляд просьбаў жыхароў аб дазволе ім утварэньня за кошт кватэрнай платы дробных рамонтаў, які павінен быў зрабіць, але не зрабіў жакт.

Грамадзкія суды пры жактах згодна праекту НКЮ могуць узьдзейнічаць на прыцягнутых да адказнасьці асоб, папярэджаньнем, грамадзкім ганьбаваньнем і штрафам да 10 руб на карысьць грамадзкіх арганізацый Калі пакрыўджанаму зроблена шкода (да 50 руб.), грамадзкі суд можа пастанавіць, каб вінаватыя ў гэтай шкодзе асобы сплацілі страты.

Пастановы грамадзкіх судоў пры жактах канчатковыя і ня могуць быць абскаржаны. Але, народны судзьдзя, у раёне дзейнасьці, якога знаходзіцца грамадзкі суд, або гарадзкі пракурор маюць права ,калі ў рашэньні грамадзкага суда ёсьць грубыя парушэньні законаў спыняць выкананьне рашэньняў і ўсю справу перадаць у народны суд для перагляду.

Самы разгляд спраў у грамадзкім судзе не зьвязан ні з якімі фармальнасьцямі і таму судзьдзёй можа быць кожны сумленны працоўны без спэцыяльнай падрыхтоўкі.

Калі палажэньне аб грамадзкіх судах будзе зацьверджана і гэтыя суды пачнуць функцыянаваць, працоўныя, якія жывуць у жактаўскіх домаўладаньнях, атрымаюць магчымасьць хуткага вырашэньня дробных спраў.

В.

Слова за гарКК і пракуратурай

Зажымшчыкаў самакрытыкі Маршака, Шпака і Лясьніка да суровай адказнасьці

Ліст у рэдакцыю

Паважаны таварыш рэдактар! На гароднінай базе МЦРК была арганізавана рабкораўская брыгада газэты «Савецкая Беларусь», у якую ўвайшлі 5 таварышоў (Розэс, Значкоў, Котніш, Капялевіч і Барадаўка).

Першая наша заметка была зьмешчана на старонках вашай газэты за 24 жніўня г. г. пад назвай «На хвалях апартуністычнага самацёку», у якой мы адзначылі тыя агідныя, якія рабіліся і зараз робяцца на нашай базе.

У момант зьмяшчэньня заметкі загадчык базы т. МАРШАК быў у камандыроўцы і калі праз пару дзён пасьля зьмяшчэньня заметкі тав. Маршак вярнуўся з камандыроўкі, дык абодвы яго памоцнікі тт. ШПАК і ЛЕСЬНІК паднесьлі яму газэту са зьмешчанай заметкай.

Прачытаўшы заметку, пад якой стаялі нашы подпісы, ён падышоў спачатку да мяне і вылаяў мяне матам і іншымі брыдкімі словамі.

Другі выпадак быў з боку тав. МАРШАКА на агульным сходзе пры выбарах рэвізійнай камісіі мясцкому, куды быў высунут загадчык гаспадаркаю тав. ПРЭС. Асабіста я быў супроць кандыдатуры тав. ПРЭСА, таму што ён летась разбазарваў маёмасьць. Пасьля мяне з адвотам супроць Прэса выступіла таксама камсамолка тав. Семянюк.

Пасьля ўсяго гэтага тав. МАРШАК прычапіўся і да т. Семянюк за тое, што яна дала адвод Прэсу.

Самае галоўнае гэта тое, што рабкораўская брыгада вашай газэты, арганізаваная пры гароднінай базе МЦРК, дзякуючы зажыму самакрытыкі з боку заг. базы тав. МАРШАКА—распалася.

Рабкор РОЗЭС.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы ліст рабкора-брыгадзіра нашай газэты тав. РОЗЭСА аб зажыме самакрытыкі на гароднінай базе МЦРК, рэдакцыя просіць ГарКК КП(б)Б і Пракуратуру неадкладнага ўмяшаньня ў гэтую справу і вінаватых у зажыме самакрытыкі прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Чэсьць памяці лепшага барацьбітарэвалюцыянэра

Учора ў чырвоную сталіцу Савецкай Беларусі прыбыло цела трагічна-загінуўшага — члена Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі — тав. А. В. Канчэўскага.

Чырвоныя сьцягі з чорнымі бантамі над клюбам Камасьветы абвяшчалі жалобу. У вялікай залі пад вянкамі ад партыйных і прафсаюзных арганізацый Менску стаяла труна т. «Владэка».

З 12-ці гадзін з усіх канцоў гораду падыходзяць працоўныя аддаць апошнюю пашану лепшаму змагару за справу пралетарыяту, за сацыялістычную рэвалюцыю на Заходняй Беларусі —ў фашыстаўскай Польшчы.

Каля 5-й гадзіны ўся вуліца каля клюбу Камсьветы была занята калёнамі працоўных.

Роўна а 5-й гадзіне труна была пастаўлена на катафал. Шматтысячная жалобная дэмонстрацыя праважала цела тав. Владка.

«Трагічны выпадак вырваў з баявых рэвалюцыйных шэрагаў авангарду пралетарыяту Заходняй Беларусі лепшага барацьбіта з фашысцкай дыктатурай прыгнечаньня працоўных—тав. Канчэўскага,—гаворыць у сваёй прамове сакратар Менгаркому КП(б)Б т. Кавальчук над сьвежай магілай. У асобе т. Канчэўскага працоўныя Заходняй Беларусі страцілі палкага, адданьнейшага барацьбіта за справу рабочае клясы,—за справу сацыялістычнай рэвалюцыі».

«У сучасны момант,—гаворыць сакратар ЦК КП(б)Б т. Гей,—у момант найвышэйшага абвастрэньня клясавай барацьбы—на пярэдадні рашаючых падзей у фашысцкай Польшчы сьмерць тав. Канчэўскага — вялікая ўтрата для рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі».

«Тав. Канчэўскі,—заявіў прадстаўнік ЦК КПП і КПЗБ,—усё сваё жыцьцё, усю сваю энэргію аддаў з самых маладых год справе рэвалюцыі,—справе рабочае клясы і працоўных. Тав. Владэк, як яго звалі ў падпольлі, з 1922 году стаў у рэвалюцыйныя шэрагі — у шэрагі Кампартыі Заходняй Беларусі. У 1924 годзе тав. Канчэўскі выбіраецца ў члены ЦК КПЗБ. З мая 1924 году па 1928 год ён змагаецца з сыстэмай фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыянэраў за кратамі фашысцкіх дамоў сьмерці. Вастрог, катаваньні не зламалі рэвалюцыйны дух т. Владэка. Пасьля турмы з 1928 году ён уступае зноў у шэрагі актыўных барацьбітоў з фашысцкай дыктатурай і выбіраецца ў члены ЦК КПЗБ. На гэтым рэвалюцыйным посту таварыш Владэк стаіць да трагічнай яго сьмерці».

Пасьля кароткіх прамоў прадстаўнікоў Італьянскай і Нямецкай кампартыі, ЦК МОПР'у БССР пад жалобныя гукі пахавальнага маршу, пад салют, —труна лепшага рэвалюцыянэра — барацьбіта т. Канчэўскага апусьцілася ў магілу.

Чэсьць яго памяці!

За бесьперабойную і чотную работу апарату сувязі

Перабудова работы апарату сувязі па БССР у асноўным закончаецца. Значная большасьць раёнаў поўнасьцю ўжо скончылі гэту перабудову. Ня скончана (паводле вестак на 20-VIII) перабудова работы апарату сувязі толькі ў 10 раёнах, з якіх большасьць гэту работу закончаюць і толькі два раёны—Дрысенскі і Гарадоцкі—яшчэ зусім не прыслалі ніякіх вестак аб ходзе перабудовы работы апарату сувязі.

Паводле вестак Бел. Кіраўніцтва сувязі на 20-га жніўня па БССР адкрыта пры сельсаветах, 902 новых пашто вых агенцтва, завербавана 3647 добра ахвотных лістаносцаў і 610 возчыкаў пошты.

Зацяжка ў адкрыцьці новых агенцтваў у значнай меры тлумачыцца непадрыхтаванасьцю на мясцох адпаведных памяшканьняў, але гэта асноўнай прычынай не зьяўляецца. Больш правільным будзе сьцьверджаньне таго, што на мясцох да гэтага пытаньня адносяцца яшчэ з недастатковай увагай.

Разам з гэтым неабходна ўказаць і на недапушчальнае благадушша самога Беларускага кіраўніцтва сувязі ў правядзеньні гэтай работы. Ня гледзячы на тое, што рад раёнаў ужо каля двух месяцаў як перабудавалі работу апарату сувязі і працуюць па новаму, Белкіраўніцтву сувязі невядома ці ліквідавана ў гэтых раёнах продажа газэт і лістоў (што вельмі часта здараецца ў практыцы работы шмат якіх пошт), ці рэгулярна і своячасова там дастаўляецца карэспандэнцыя, які адбітак мела перабудова работы апарату сувязі на ўзьняцьці падпіскі на газэты і г. д.

Як відаць у Белкіраўніцтве сувязі захапіліся толькі колькаснымі паказьнікамі, зусім запамятаўшы пра ўзьняцьце якасьці работы.

Між тым паводле слоў самых працаўнікоў Белкіраўніцтва сувязі, якія непасрэдна кіруюць перабудовай работы апарату сувязі, у цмат якіх мясцох гэта работа праходзіць ня зусім гладка. Ёсьць выпадкі, калі лістаносцы калгасьнікі, замест таго, каб разносіць карэспандэнцыю адрэсатам абмяжоўваюцца, тым, што газэты і лісты прыносяць проста ў праўленьне калгасу, адкуль яны часта прападаюць, або перадаюць першаму сустрэчнаму, які не адказны за дастаўку карэспандэнцы адрасату.

Белкіраўніцтва сувязі павінна клапаціцца ня толькі аб колькасных паказьніках работы па перабудове апарату сувязі, але і аб якасьці гэтай работы. Толькі ў гэтым выпадку БКС зможа заявіць, што апарат сувязі сапраўды перабудаваў сваю работу адпаведна задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

М. П-скі.

ПАПРАЎКА

У зводцы НКЗ, зьмешчанай у № 205 газ. «Савецкая Беларусь» за 5 верасьня 1931 году па віне статыстыкі НКЗ дапушчаны памылкі. Надрукавана: па Чавускім раёне ўбрана лёну 23,3 проц., абмалочана да ўбранага—18,8 проц.; па Смалявіцкім раёне ўбрана—27,2 проц., павінна быць: па Чавускім раёне ўбрана лёну—92,9 проц., абмалочана да ўбранага—23,3 проц., па Смалявіцкім раёне ўбрана лёну—97,2 проц.

Адказны рэдактар **П. ШАСТАКОЎ.**

ТЭАТР-КІНО-ЦЫРК

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР — Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева **Чайхана ў горах**
Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк — Сёньня пачатак гастроляў новых артыстых
Лепшыя ў СССР Клео Дароці, жанчына Ілюзіяністка. Заслужаныя артысты ССРГ бр. Танці. Папулярныя музычныя сатырыкі—новы рэпэртуар
Замежная артыстка Вольга Малава | Жанглёры-малабарыстых Бэуман і Мяцёлкін
Лепшыя ў СССР атракцыёны--сусьветны рэкорд--плаваньне ў паветры 6 Эльворці 6
Вышэйшае дасягненьне эквілібрыстыні 2 Голядзе 2
5 Богадэ 5 акрабаты. Турністы 3 Марос 3
Новая групавая дрэсыроўка коняй т. В. Лапінда.
Выезд пегрыянскіх наезьнікаў жакеяў 4 КУК 4
Музычны інструмэнталісты Вероніка | Выезд и езьніка Пэрвіль | Спарт. акрабаты Веомаш
Унівэрсальныя артысты бр. МАКЕЕВЫ
Каса ад 12 гадз. дня. Білеты са скідкай у рабочай касе. Пачатак а 9 гадз.

Кіно-тэатр Культура — Новы мастацкі фільм прысьвечаны дню МЮДу **1-я КАМСАМОЛЬСКАЯ** У гал. ролі арт. Пакроўская

Кіно „Інтэрнацыянал" — З 5-га верасьня замежны фільм Поля Нэгрі **„Калючы дрот"** Каса з 12 гадзіне.

Кіно „Пралетары" — Мастацкі фільм з жыцьця Ламаносава **Сын рыбака** Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 10-30 г.

„Чырвоная Зорка" — З 5-га верасьня **ЦІХІ ДОН** па выд. раману Шолахава. Звыш праграмы. Буравесьнік. Каса з 5 гадз. Цэны паніжаны.

ПРЫ ЛЁНАСАЎГАСЕ БОРКАВІЧЫ, ДРЫСЕНСКАГА РАЁНУ

АДЧЫНЯЕЦЦА ШКОЛА САЎГАСВУЧУ

У школу прымаюцца: бронь-падлеткі саўгасаў, выхав. дзіцячых дамоў, дзеці рабочых, рабочыя саўгасу, калгасьнікі і вакольных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, скончыўшыя 4-хгодку.

Пры заяве павінны быць: 1. Анкета, 2. Даведка аб сацыяльным становішчы, 3. Мэтрычная дзведка, 4. Пасьведчаньне аб адукацыі і 5. Даведка аб стане здароўя.

Прыём заяў да 15-IX. Пачатак заняткаў 1-X.

ПРЫНЯТЫЯ задавальняюцца ІНТЭРНАТАМ і СТЫПЭНДЫЯЙ

ЗАЯВЫ накіроўваць па адрасу: саўгас Боркавічы.

Заг. Саўгасвучу ДЖУМОК

БАЛЯНС

Петрыкаўскага Райкаапмалжывёлсаюзу на 1-VII 1931 году

Аддзел	Шыфр	Назва галоўнага рахунку	Актыў Руб.	Актыў Кап.	Пасыў Руб.	Пасыў Кап.
1	1	**Каса**	—	—	—	—
2	66	Тавары збыту	10123	87	—	—
„	45	Тавары спабжэньня	68146	94	—	—
„	50	Тара	3746	50	—	—
„	31	Матар'ялы	422	46	—	—
3	101	Вытворчасьць пер. малака	—	—	—	—
„	102	„ адкорм. сьвіней	—	—	—	—
4	—	Кантакарэнты ў Дзяржбанку				
	69/451	Тав. спабжэньне	—	—	47471	93
„	„ 452	„ збыт	—	—	4401	06
„	„ 453	„ мясазагатоўкі	—	—	6452	82
„	„ 454	„ вымачкі (насен дап.)	—	—	8250	—
„	„ 455	„ адлічэньня (на выдат.)	1939	87	—	—
5		**Дэбіторы і крэдыторы**				
	60	Паселішчныя таварыствы	17769	72	368	54
	75	Калгасы	9308	24	771	13
	80	Саўгасы	—	—	1177	72
	77	Дзяржуст. і каап. арган.	8148	29	328	64
	88	Адзіналічн. гасп. зад.	—	—	642	02
	55	Даўгі сялян. па загат. за зданую продукцыю	3095	50	29856	42
6	100	Падсабраваздачныя асобы	4641	34	217	50
	200	Неапэрацыйныя разьлікі	2450	62	17863	88
	300	Прэтэнзіі і рэклямацыі	12643	76	5082	16
	320	Нянпэўныя даўгі	1440	57	—	—
7	105	Пазыкі (выдадзеныя)	11634	48	—	—
	6	Пазыкі (атрыманыя)	—	—	11297	11
8	20	Накладныя выяткі на тав.	11	—	—	—
	22	Накладаньне на нерэалізав. тавары	—	—	6484	63
9	4	Каштоўныя паперы	1000	—	—	—
	7	Паі ў Белхлебжывёлсаюзе	4338	51	—	—
	9	Уклады дэпазіты (Петр. Дзярж.)	558	23	—	—
10	10	Маёмасьць	16741	33		
	12	Капітальнае будаўніцтва				
11	40	Капіталы ўласныя	—	—	16396	80
	41	„ паявыя зваротныя	—	—	4842	13
	42	„ зварот. спец. прызн.	—	—	4246	72
	44	Фонды і рэзэрвы на нянпэўныя даўгі	—	—	1974	74
12	62	Тавары адгружаныя на акцэпт.	6314	50	—	—
	63	„ па перав. ішг гар.	7238	15	—	—
	64	„ па налож. плацяж. іншагарод.	418	38	—	—
	65	„ аднагар. пакуннік.	8493	63	—	—
13	120	Адліч. цэнтр, устан. і на прам. падаткі	—	—	5343	—
	140	Вынікі і рэалізацыя	—	—	—	—
14	130	Выдаткі бягучага году	30116	65	—	—
	170	Прыбыткі	—	—	48883	68
	99	Прыбыткі і страты мінул. гадоў	8321	52	7011	43
—	—	**Баланс**	229064	06	229064	06

Пятрыкоўскі „Райкаапмалжывёлсаюз"

Галоўны бухгальтар (подпіс)

Таварыства Садзейнічаньня Рацыяналізацыі Вучоту (ОРУ)

АРГАНІЗУЕ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ РАХУНКАВОДАЎ

для ўстаноў і прадпрыемстваў г. Менску і для раёнаў

Слухачы раённай групы забясьпечваюцца стыпэндыяй 50 руб. у месяц (кватэрамі не забясьпечваюцца). Слухачы гарадзкой групы навучаюцца дармова. Тэрмін навучаньня ад 3 да 6 м-цаў

Заявы прымаюцца ў канцэлярыі ОРУ (Савецкая, 55, уваход з варот тэл. № 11-99) ад 10 да 12 гадз. дня да 5 верасьня.

Да заявы неабходна дадаць наступныя дакуманты: 1) аб сацыяльным становішчы, 2) аб праве голасу, 3) аб узросьце (ня менш 17 гадоў) і аб адукацыі (ня ніжэй 5 груп)

Калгасьнікі павінны прадставіць згоду свайго праўленьня

БЕЛАРУСКІ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае, што

ЎСТУПНЫЯ ІСПЫТЫ ДЛЯ ЎНОЎ ПАСТУПАЮЧЫХ ПАЧНУЦЦА З 7-га ВЕРАСЬНЯ 1931 г.

а 10-й гадз. раніцы ў галоўным корпусе БДУ, аўдыторыя 203

Асобы, атрымаўшыя пасведамленьне аб іспытах, павінны зьявіцца ў Інстытут да паказанага часу.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 1-ы курс асеньняга набору—31 г. ПРАЦЯГВАЕЦЦА да 10-га верасьня 1931 г.

ЗАЯВЫ ПАСЫЛАЦЬ У НКФ БССР (СЭКТАР КАДРАЎ)

Правілы аб прыёме глядзеце ў газэтах: „Савецкая Беларусь" ад 27-VII і 1-VIII і „Калгасьнік Беларусі" ад 29-VII—1931 г.

Дырэкцыя

ПРЫЁМ ЗАЯЎ

на 1 курс Мсьціслаўскага Пэдтэхнікуму і на аднагадовыя пэдкурсы

ПРАЦЯГНУТ да 15 верасьня г. г.

Нам. дырэктара Мсьціслаўскага Пэдтэхнікуму

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—4-78, сэкратара—4-78, сэктараў —6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў [illegible] на год—12 руб.

Главлітбел № 593

Друкарня імя СТАЛІНА